# ЗДАРОВЫ ДУХ І ЗДАРОВАЕ ЦЕЛА

**Дзве з пяці прэзідэнцкіх прэмій «За духоўнае адраджэнне» па выніках мінулага года атрымалі прадстаўнікі Гомельскай вобласці. Архіепіскапу Гомельскаму і Жлобінскаму АРЫСТАРХУ прэмія прысуджана з фармулёўкай «За значны асабісты ўклад у адраджэнне і захаванне духоўнай, гістарычнай і культурнай спадчыны беларускага народа».**

Калі 20 гадоў таму Уладыка прыехаў з Троіца-Сергіевай Лаўры на Гомельшчыну, тут былі толькі 43 праваслаўныя прыходы. Цяпер вобласць падзеленая на дзве епархіі — Гомельска-Жлобінскую і Мазырска-Тураўскую. І ў кожнай з іх — больш чым па 120 прыходаў. Тым не менш архіепіскап падкрэслівае, што прэзідэнцкая прэмія — гэта заслуга ўсіх хрысціян Гомельскай вобласці.

— Гэта заслуга ўсіх вернікаў, якія зрабілі ўсё, каб адчыняліся праваслаўныя храмы, каб духоўны пачатак браў верх над усім мірскім. Вось таму мы і жадаем адно аднаму быць сапраўднымі хрысціянамі і несці ў жыццё святло, дабрыню і духоўны дабрабыт.

7 студзеня 1990 года, роўна 20 гадоў таму, менавіта на свята Нараджэння Хрыстовага ў Гомельскім саборы святых Пятра і Паўла пасля доўгага антырэлігійнага перапынку зноў загучала малітва. Так зноў забілася духоўнае сэрца прыходскай суполкі. Між тым, той далёкі і складаны час архіепіскап успамінае з цеплынёй.

— Працы было вельмі многа. Але ж з Божай дапамогай усё з'явілася. У нас як у арміі — там загад, а у нас — паслушэнства. Такі крыж.

Між тым, Гомельшчына — малая радзіма архіепіскапа Арыстарха. Ён нарадзіўся ў вёсцы Асавецкая Буда Мазырскага раёна ў год, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Яго сям'я, нягледзячы на складаны для вернікаў час, заўсёды жыла па прынцыпе: «Без Бога — ні да парога». Яго старэйшыя браты сталі манахамі Пачаеўскай Свята-Успенскай лаўры. Магчыма, яны натхнілі тады маладога чалавека служыць Госпаду. Многія людзі, у тым ліку настаяцель Гомельскага Свята-Міхайлаўскага храма, протаіерэй Андрэй Бялянка, лічаць архіепіскапа сваім асабістым настаўнікам.

— Дзякуючы яго намаганням, адбылося маё духоўнае станаўленне. Ён для нас — як бацька, а не проста кіраўнік епархіі.

**Трэнер-выкладчык па лёгкай атлетыцы Гомельскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы прафсаюзаў «Лідар» Уладзімір КАЦУРА высокую ўзнагароду «За духоўнае адраджэнне» атрымаў за значныя дасягненні ў сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў. Сярод яго выхаванцаў ёсць пераможцы дэфалімпійскіх гульняў — у іх бяруць удзел людзі, якія дрэнна чуюць.**

На трэніроўках Уладзіміра Кацуры — незвычайная цішыня. І каманды, і адказы — толькі з дапамогай жэстаў. Ён займаецца з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі па слыху. Спартыўная методыка тут звычайная, а вось псіхалагічная — зусім іншая. Хоць трэнеру больш, чым іншым, зразумелыя праблемы сваіх выхаванцаў — ва Уладзіміра таксама слабы слых. Але ж трэнер ён строгі, гаворыць адна з лепшых выхаванак, уладальніца сусветнага рэкорду Маргарыта Гралько.

— Ён заўсёды патрабуе парадак і дысцыпліну на трэніроўках.

Сваім прыкладам Уладзімір Кацура выхаваў многа добрых спартсменаў і лічыць, што спорт глухіх — гэта тая ж барацьба, трэніроўкі, узлёты і падзенні, як і ў спорце звычайным. Ён быў шчыра здзіўлены, што трапіў у пяцёрку лаўрэатаў і атрымаў прэмію Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне».

— Вядома ж, мне прыемна, хоць і нечакана. Я вельмі люблю сваю працу. І прэмія — наша агульная перамога.

Між тым, высокая ўзнагарода, без сумнення, стане стымулам для новых высокіх спартыўных дасягненняў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Запрашальнік

# БАЛЬНЫЯ КЛОПАТЫ

*Баль як працяг традыцыі святкавання старога Новага года*

**І не трэба клапаціцца пра штучную карэту з гарбуза — значна прасцей можна патрапіць на «Вялікі навагодні баль у Вялікім тэатры» вечарам 13 студзеня. Гэта ж цудоўная магчымасць стварыць сабе казку і працягнуць свята.**

Напярэдадні старога Новага года адноўлены і аб'яднаны тэатр вырашыў даказаць, што можа прымаць гасцей не горш, чым у палацы і з не меншым размахам. Нездарма арганізатары балю вырашылі аднавіць у сценах Вялікага тэатра оперы і балета атмасферу сапраўднага балю сярэдзіны XIX стагоддзя — класічная музыка, прыгожыя дамы ў шыкоўных сукенках, бліскуча-галантныя кавалеры... І часам не трэба выклікаць фею, каб такімі стаць, а дастаткова дастаць з шафы свае лепшыя і, магчыма, адкладзеныя да лепшых часоў строі. Бо гэта і ёсць той час, калі іх апранаць: для ўсіх гледачоў абавязковым з'яўляецца святочны дрэс-код.

І калі пачнецца канцэрт і паказ, то ўсе зразумеюць, дзеля чаго такія парадкі: артысты на сцэне дадуць уяўленне пра баль, які мог бы адбыцца ў старажытнасці ў палацы беларускага князя, а потым перанесціся на баль у Вену ці Расію. Дзеля таго, каб баль змог уразіць уяўленне сучаснага чалавека, над яго стварэннем працавалі ўсе сілы тэатра — опера, балет, а таксама запрошаныя артысты. Тры аркестры на працягу вечара будуць выконваць папулярную сімфанічную музыку, знакамітыя арыі з опер і аперэт, рамансы. І, вядома, які баль без венскага вальса?

Арганізатары стараліся прадумаць усё, каб чалавек, які прыйшоў на баль, не сумаваў ні перад пачаткам канцэрта, ні ў перапынку.

Але галоўнае, што кожны з гасцей зможа адчуць сябе ў коле сяброў, з якімі сапраўды прыемна сустракаць Новы год. Няхай і Стары.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Абзац

◢ У Беларусі 2009 год стаў рэкордным для ўсынаўлення. Летась сям'ю знайшлі 582 беларускія дзіцяці-сіроты — гэта самы высокі паказчык за 12 гадоў працы Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення.

◢ **Пракуратура Баранавічаў распачала крымінальную справу ў дачыненні да начальніка аддзела прадстаўніцтва «Белдзяржстраха» па гэтым горадзе. Начальнік аддзела падазраецца ў тым, што ў перыяд са студзеня 2007 г. па чэрвень 2009 г., фіктыўна аформіўшы страхавым агентам сваю знаёмую і заключаючы ад яе імя дагаворы страхавання, незаконна атрымала камісійнае ўзнагароджанне ў агульнай суме больш за Br32 млн. Фактычна дагаворы заключала сама начальнік аддзела, аднак узнагароджанне яна не павінна была атрымліваць.**

◢ Тэлебачанне павялічвае рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў на 80 %. Паводле вынікаў даследаванняў аўстралійскіх навукоўцаў, у людзей, што бавяць перад тэлевізарам больш за тры гадзіны штодзень, узрастае рызыка сардэчнага прыступу. У тых, хто глядзіць у экран больш за 4 гадзіны ў дзень, павялічваецца імавернасць захворвання сардэчна-сасудзістай сістэмы на 80 %. Кожная гадзіна прагляду тэлевізара таксама павялічвае на 9 % рызыку захворвання ракавых захворванняў. Праўда, навукоўцы не ўдакладняюць: гэта менавіта ўплыў тэлевізара ці гаворка проста пра сядзячы лад жыцця.

## Поўны абзац

◢ **Купля аўтамабіля коштам 150 тыс. юаняў (22 тыс. долараў) заняла больш за 4 гадзіны ў адным з салонаў кітайскай правінцыі Хэнань. Прычына ў тым, што пакупнік расплаціўся за машыну металічнымі грашыма. Для таго, каб даставіць амаль 700 кг медзякоў у салон, кітайцу спатрэбілася 20 пластыкавых пакетаў і спецыяльна наняты ў арэнду пікап. 4 гадзіны персанал пералічваў манеты. У аперацыі па прыёмцы такой вялікай сумы былі задзейнічаны больш за 100 супрацоўнікаў салона. Прычына, па якой мужчына вырашыў расплаціцца за аўто такім спосабам, не ўзгадваецца.**

◢ Форвард зборнай Балгарыі і «Манчэстэр Юнайтэд» Дзімітар Бербатаў атрымае каштоўны малюнак, на якім увасоблены ён сам. Італьянская мадэль і па сумяшчальніцтве порназорка з загадкавым імем Сімба ў сваім творы дала футбалісту новае, больш эратычнае імя — DimiART Boobatov. Дзяўчына наносіла фарбы не звычайным спосабам, а з дапамогай шыкоўных грудзей.

◢ **У Даніі 3-гадовага хлопчыка «здалі» ў багаж. Інцыдэнт адбыўся на мінулых выхадных у аэрапорце Капенгагена. У той час, калі маці дзіцяці шукала білеты, дзіця забралася на стужку для багажу — і паехала. Хлопчык праехаў цераз сканер, затым камп'ютар, які не змог вызначыць тып багажу ды наклеіў на дзіця налепку «спецыяльны багаж», а потым адправіў яго далей. Дзіця выратаваў работнік аэрапорта, які пачуў плач малога. Хлопчыка цэлага і здаровага вярнулі маці.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## «ЗАТАВАРЫЛІСЯ» КАЎБАСОЙ

**Трое зламыснікаў спрабавалі вынесці праз прахадную сталічнага мясакамбіната 30 батонаў каўбасы, якую адзін з іх — 20-гадовы грузчык гэтага прадпрыемства — папярэдне схаваў у... прыбіральні.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, ахову прадпрыемства насцярожыў нецвярозы малады чалавек, які выходзіў на вуліцу з камбіната. Калі яго паспрабавалі затрымаць, той кінуўся наўцёкі, а з-пад курткі пачалі падаць батоны каўбасы. І хоць злачынцу ўдалося знікнуць, яго асоба высветлілася пасля, калі ахоўнікі затрымалі двух саўдзельнікаў «несуна», якія таксама праз прахадную ішлі з прыхаваным каўбасным грузам.

У прыватнасці, выявілася, што работніку прадпрыемства падчас загрузкі ўдалося прыхаваць 30 батонаў каўбасы, якія ён пакінуў у прыбіральні. Аднаму яму было не вынесці такую колькасць мясных вырабаў, а таму да справы ён прыцягнуў двух сябрукоў. Спярша хлопцы выпілі, а потым праз агароджу пранікі на тэрыторыю прадпрыемства. І хоць зладзюжкі дабраліся да схованкі і «затарыліся» там каўбасой, ажыццявіць да канца свае планы ім так і не ўдалося.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Гучная справа

# ДЗЕ 30—40 МЛН ДОЛАРАЎ?

**Экс-старшыня камітэта сойма па нацыянальнай бяспецы і абароне Альгімантас Матулявічус пракаментаваў расследаванне гібелі 23 жніўня 2006 года ў Брэсце афіцэра Дэпартамента дзяржаўнай бяспекі, дарадцу генконсульства Літвы ў г. Гродна Вітаўтаса Пацюнаса і пацвердзіў адну з ранейшых не афіцыйных версій інцыдэнту.**

Матулявічус паведаміў, што атрымаў звесткі аб сувязі смерці Пацюнаса з расследаваннем ім растраты сродкаў, выдаткаваных дэпартаменту на падтрымку беларускай апазіцыі. Паступіў сігнал аб тым, што некаторыя супрацоўнікі ДДБ маюць намер даць паказанні аб растраце часткі 30—40 млн долараў, выдаткаваных на гэтыя мэты. Пасля парламенцкага расследавання дзейнасці дэпартамента дзяржаўнай бяспекі істотных перамен у спецслужбе не адбылося, і гэтыя асобы адмовіліся ў мэтах уласнай бяспекі ад дачы адпаведных паказанняў.

Нагадаем, што двойчы расследаванне па факце гібелі Пацюнаса спынялася з-за таго, што пракуратура канстатавала гібель у выніку нешчаслівага здарэння (Пацюнас выпаў з акна гасцінічнага нумара). Блізкія афіцэра абскарджвалі ў судзе гэтыя пастановы. Аб неафіцыйнай версіі гібелі Пацюнаса пісала яшчэ ў 2006-м адна свабодная «жоўтая» газета Літвы: «Пацюнас па асабістай ініцыятыве і без санкцыі кіраўніцтва ДДБ пачаў расследаванне расходу 420 млн долараў ЗША, нібыта вылучаных Кангрэсам ЗША на звяржэнне рэжыму Прэзідэнта Беларусі А. Лукашэнкі. Значная частка гэтых сродкаў пераводзілася ў Літву, дзе яны абнаяўліваліся кур'ерамі і дастаўляліся ў г. Мінск. Пацюнас высветліў, што частка сродкаў для арганізацыі «каляровай рэвалюцыі» расходавалася высокапастаўленымі супрацоўнікамі ДДБ Літвы, якія мелі да іх доступ, не па прызначэнні».

Са зменай кіраўніцтва Літвы і нядаўнім змяшчэннем ранейшага гендырэктара ДДБ П. Малакаўскаса, магчыма, названая версія атрымае дакументальнае пацвярджэнне і стане падставай для дадатковага расследавання ў дачыненні да былых і дзейных супрацоўнікаў ДДБ, а таксама будзе ўлічвацца падчас рэформы спецслужбы.

**Аляксей МАРОЗАЎ.**

# ТАКОГА СНЕГАПАДУ

**даўно не было ў Брэсце. За суткі колькасць ападкаў перавысіла дэкадныя нормы. За другую палову дня ў нядзелю і ноч на панядзелак па вобласці выпала ад 33 да 65 працэнтаў дэкаднай нормы снегу. Самыя моцныя снегапады зафіксаваны ў Высокім Камянецкага раёна і абласным цэнтры.**

Многія брастаўчане ўчора не змаглі раскапаць са снегу свае машыны і вымушаны былі дабірацца грамадскім транспартам. Апошні ў сваю чаргу з-за складаных умоў надвор'я таксама працаваў не бліскуча. Але, акрамя спазненняў на працу, нехарактэрная для Брэста стыхія на ўзровень надзвычайных сітуацый не паўплывала. Паводле інфармацыі абласнога ўпраўлення МНС, раніцай у панядзелак дзясяткі населеных пунктаў у Брэсцкім, Столінскім, Пінскім раёнах былі без электрычнасці па прычыне абрыву правадоў ліній электраперадач. Але наступствы лакальных аварый былі ліквідаваны аператыўна. Сітуацыя на дарогах, паводле інфармацыі ДАІ, заставалася звычайнай для такой пары. У ноч з нядзелі на панядзелак на трасе Гомель — Кобрын у кювет зляцела легкавушка, дзяўчына-пасажыр атрымала траўмы і была дастаўлена ў бальніцу. Астатнія 11 ДТЗ за суткі абышліся без пацярпелых. Але ж супрацоўнікі ДАІ настойліва раяць аўтааматарам устрымлівацца ад паездак. Становішча на дарогах застаецца складаным, бо тэхніка камунальных службаў не паспявае спраўляцца з такой лавінай снегу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На сталічных вуліцах таксама назіраюцца снежныя гурбы.

Хочаце — верце...

# БУДЗЕМ ПІЛЬНЫМІ І Ў СЛОВАХ, І Ў СПРАВАХ...

*15 студзеня нас чакае самае працяглае ў XXI стагоддзі кольцападобнае сонечнае зацьменне*

Вобласць найлепшай бачнасці прыйдзецца на экватарыяльныя і трапічныя шыроты паўночнага паўшар'я (кольцападобную фазу можна будзе назіраць у цэнтральнай Афрыцы, на поўдні Індыі і ў Кітаі). Свайго максімуму зацьменне дасягне ў кропцы з каардынатамі 1,6 градуса паўночнай шыраты і 69,3 градуса ўсходняй даўгаты. Яго працягласць у максімуме складзе 11 хвілін 8 секундаў, а шырыня месяцавага ценю на зямной паверхні будзе раўняцца 333 км.

Кольцападобнае зацьменне — гэта зацьменне, пры якім зямную паверхню перасякае конус-працяг месяцавага ценю. Сонца зімой бліжэй да Зямлі, чым летам, таму верагоднасць поўнага зацьмення ніжэй — Месяц не можа закрыць Сонца цалкам. Менавіта таму на момант максімальнай фазы зацьмення Сонца будзе нагадваць кольца, якое свеціцца (Месяц закрые толькі 0,919 дыяметра сонечнага дыска і пакіне бачным тонкі абадок). Падчас кольцападобных зацьменняў яркі абадок Сонца не дазваляе пабачыць ні карону, ні зоркі паблізу ад Сонца.

...Яшчэ старажытныя астраномы ў VI стагоддзі да нашай эры, назіраючы за рухам нябесных цел, здолелі выкрыць сапраўдную прычыну зацьменняў. Аднак гэтыя веды на працягу многіх стагоддзяў былі даступныя толькі адукаванай эліце, у той час як большасць успрымала гэтую з'яву як кару багоў, прадвесце канца свету і г.д. На пачатку Пелапанэскай вайны паміж старажытнагрэчаскімі гарадамі-дзяржавамі Афінамі і Спартай сонечнае зацьменне ледзь не сарвала ваенна-марскую экспедыцыю афінян, якімі камандаваў выдатны стратэг Перыкл (каля 490 — 429 гг. да н.э.). Калі афінскі флот быў гатовы адплываць, пачалося сонечнае зацьменне. Раптоўная цемра так напалохала маракоў і салдатаў, што яны страцілі свой баявы дух. Армія была дэмаралізаваная. Вучань знакамітага ў тагачасным свеце філосафа Анаксагора (каля 500 — 428 гг. да н.э.) Перыкл быў адукаваным чалавекам і добра разумеў прычыну зацьменняў. Ён закрыў сваім плашчом вочы лоцману і запытаўся ў таго, ці бачыць ён у плашчы нейкі дрэнны знак ці прадвесце. «Не», — адказаў лоцман. — «У чым жа тады розніца паміж гэтым плашчом і тым целам, якое закрыла Сонца, хіба толькі ў тым, што яно большае за мой плашч!» Дзеянні і словы Перыкла супакоілі не толькі лоцмана, але і астатніх салдатаў. Ваенная экспедыцыя прайшла згодна з планам. Паводле разлікаў, тое сонечнае зацьменне не было поўным (Сонца было закрыта Месяцам на 80 працэнтаў) і адбылося ў Грэцыі 3 жніўня 431 года да новай эры, што дапамагло ўдакладніць дату пачатку і працягласць Пелапанэскай вайны (431—494 гг. да н.э.)

**...Паводле сцвярджэння беларускага астролага Людмілы Савельевай, гэтае сонечнае зацьменне — выдатны час для пазбаўлення ад дрэнных сувязяў, якія псуюць вашу рэпутацыю. Гэта адзін з найлепшых перыядаў для таго, каб пазбавіцца ад працы, якая надакучыла, ад непрыемнага асяродку кантактавання.** Азначаны перыяд звязаны і са здароўем **(выдатны час для пачатку курсу доўгатэрміновага лячэння). Аднак гэта не самы выдатны час для таго, каб узяць шлюб і падпісання важных дакументаў.** З улікам таго, што Меркурый будзе знаходзіцца ў рэтраградным становішчы, шмат якія падпісаныя ў гэты час дакументы і ўзятыя на сябе абавязацельствы могуць абярнуцца супраць вас. **У плане дарожна-транспартных здарэнняў, любых наваўвядзенняў і рэформаў зацьменне 15 студзеня з'яўляецца адным з самых небяспечных.** Шмат у чым час зацьмення будзе звязаны з пацвярджэннем эпохі фінансава-эканамічнага крызісу, які насамрэч толькі набірае моц, таму не варта здзіўляцца, калі нешта ў свеце будзе адбывацца не так, як мы хочам. Астролаг папярэджвае, што гэты час будзе адным з самых крытычных.

**У такі перыяд варта пазбягаць неабдуманых рашэнняў, авантур, сустрэч з малазнаёмымі людзьмі. Час зацьменняў найлепш пераносяць людзі з вельмі здаровай псіхікай, з жорсткай, дакладнай, прагматычнай жыццёвай праграмай.**

Паводле слоў расійскага астролага Нані Давіташвілі, у час зацьмення ў жыцці чалавека нечакана ўзнікне магчымасць прыняць на сябе больш значную адказнасць. Гэтыя новыя абавязкі, хутчэй за ўсё, будуць вынікам няздольнасці іншага чалавека іх выконваць. Хоць падзеі, пра якія апавяшчае гэтая магчымасць, могуць быць цяжкімі, канчатковыя вынікі ў плане дасягнення гармоніі і развіцця пачуцця ўласнай годнасці будуць пазітыўнымі. У першую чаргу зацьменне закране жыцці людзей, народжаных 14.01, 15.01, 16.01, 14.04, 15.04, 16.04, 17.07, 18.07, 19.07, 18.10, 19.10, 20.10.

Што датычыцца надвор'я, падчас зацьмення магчымыя моцныя снегапады і нават лавіны, лічыць астролаг, павышаецца верагоднасць маштабных разбурэнняў.

У міжнародным плане астролаг папярэджвае аб вялікай верагоднасці мэтанакіраванай і прадуманай эскалацыі да новай вайны з акцэнтам на ісламскія краіны. У гэтым сэнсе асабліва крытычнымі будуць даты з 29.01 па 01.02. **Ёсць падставы меркаваць, лічыць астролаг, аб крытычнай сітуацыі ў фінансавым становішчы Амерыкі.** Гэты складаны перыяд прымусіць ЗША карэнным чынам перагледзець існуючую сістэму і выбраць поўную яе трансфармацыю, як адзіны спосаб выжыць.

**Увогуле, астролагі сцвярджаюць, што заўважны ўплыў зацьменняў пачынаецца за тры дні да самога зацьмення і цягнецца яшчэ тры дні пасля. У гэты перыяд пастарайцеся быць асабліва асцярожнымі і пільнымі — і ў словах, і ў дзеяннях.**

**Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.**

# НА СТАРЫ НОВЫ ГОД МОЖНА ЗАЗІРНУЦЬ У БУДУЧАЕ

**Паводле народнага павер'я, самай дакладнай лічыцца варажба на стары Новы год — у ноч з 13 на 14 студзеня, хоць варажыць можна на працягу ўсіх дзён святак, расказалі ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі.**



Фота БЕЛТА.

У народзе верылі, што ў святыя вечары прывіды, лесуны, духі ходзяць па зямлі. Таму гэты перыяд лічыўся найбольш спрыяльным для прадказанняў лёсу, у прыватнасці замужжа. Найбольш папулярным у вясковай моладзі быў спосаб варажбы на розных прадметах — цот або лішка. Парная колькасць сімвалізавала сямейную пару, а няпарная — адзіноту. Напрыклад, выходзілі на двор і набіралі дроў. Прыносілі іх у хату, лічылі цотная або няцотная колькасць. З гэтай жа мэтай абхоплівалі дошкі ў плоце. І зноў цотная колькасць або няцотная азначала альбо блізкае вяселле, альбо наадварот. Практычна ўсюды сустракаўся і такі звычай: пасярод дома насыпалі кучку зерня і пускалі пеўня падзяўбці, а рэшту пералічвалі. Не менш распаўсюджаным спосабам варажбы было падслухванне пад вокнамі суседскіх хат. Калі ў хаце размаўлялі спакойна — добрая прыкмета, а вось калі лаяліся або спрачаліся — замужняе жыццё абяцала быць неспакойным.

Акрамя таго, згодна з павер'ем у ноч з 13 на 14 студзеня сняцца вешчыя сны. Каб убачыць у сне будучага мужа, дзяўчына брала са святочнага стала крыху куцці, загарнуўшы яе ў хустку, клала пад падушку. А вось яшчэ адзін спосаб убачыць будучага мужа. Трэба чыстай расчоскай расчасаць на ноч валасы і пакласці яе пад падушку са свежай навалачкай. Перад сном трэба ўявіць вобраз жаданага чалавека. Можна таксама пакласці пад падушку чатыры картачныя каралі. Пры гэтым трэба сказаць: «Хто мой нарачоны, хто мой жаніх — той прысніся». Нарачоны прысніцца ў вобразе якога-небудзь караля.

Можна выкарыстаць чысты аркуш паперы. Кожная дзяўчына (удзельнічаюць 2-3 варажбіткі) комкае аркуш і падпальвае яго на чыстай талерцы. Утвараецца горка попелу і рэшта паперы. Пры дапамозе свечкі трэба стварыць праекцыі ценяў на сцяне. Разглядаючы цені, можна ўбачыць розныя карціны, вобразы, сімвалы, па якіх і тлумачыць будучае.

Ёсць і такая варажба. Бяруцца два вялікія аднолькавай велічыні люстэркі, устанаўліваюцца адзін супраць аднаго, асвятляюцца дзвюма свечкамі. Лепш за ўсё трымаць люстэрка супраць высвечанага так, каб з накіраванага люстэрка атрымаўся доўгі азораны агнямі калідор. Вось у канцы гэтага калідора і павінен з'явіцца нарачоны. Дзяўчына-варажбітка павінна выдаліць з пакоя кошак, сабак, птушак і пабочных асобаў. Могуць застацца дзве ці тры сяброўкі, якія не глядзяць у люстэрка і не размаўляюць з дзяўчынай, якая варожыць.

Аб тым, хто ж будучы жаніх, можна даведацца і па браханні сабакі. Хрыплае браханне — жаніх стары, звонкае — малады, а прыглушанае — удавец або разведзены. Пра будучыню гадалі і з дапамогай кнігі. Лепш за ўсё ўзяць кнігу духоўнага зместу. Не раскрываючы яе, неабходна загадаць нумар старонкі і радка зверху ці знізу, раскрыць яе і чытаць у названым месцы. Тлумачаць прачытанае, як правіла, адпаведна таму, што больш за ўсё цікавіць таго, каму варожаць, — дастатак, паездкі, жаніцьба, здароўе і г.д.

З дапамогай варажбы можна даведацца і аб тым, якім будзе ў новым годзе надвор'е. Для гэтага неабходна разрэзаць цыбуліны на часткі. Кожная долька — адзін месяц. Потым цыбулю пасыпаць соллю і пакінуць на ноч. На якой дольцы раніцай соль намокла, тыя месяцы будуць дажджлівымі або снежнымі, а дзе не — сухімі.

**БЕЛТА.**

Падпіска-2010

# У НОВЫ ГОД — З НОВЫМ ЦУДОЎНЫМ НАСТРОЕМ

Паважаныя падпісчыкі! Як мы і абяцалі, сёння друкуем спісы шчаслівчыкаў, якім выпалі каштоўныя прызы па выніках падпіскі на 1-е паўгоддзе 2010 года.

Прыемна, што геаграфія прызоў, як заўсёды, шырокая. Нельга не адзначыць і той факт, што колькасць ахвотных паўдзельнічаць у розыгрышы павялічылася. Праўда, на жаль, не ўсе падпісчыкі змаглі стаць яго ўдзельнікамі. І прычына таму — нестандартная картка. Яшчэ раз нагадваем: не трэба наклейваць запоўнены купон на кардон ці нейкую цвёрдую паперу! Па ўмовах латарэі, такія квіткі да ўдзелу не прымаюцца.

Упэўнены, што такіх недарэчнасцяў у наступных розыгрышах не будзе, а актыўнасць прыхільнікаў старэйшага беларускамоўнага выдання ў розыгрышы прызоў будзе яшчэ большая. Шмат у чым таму, што агульны тыраж газеты «Звязда» ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года «падрос». Дзякую за падтрымку!

І яшчэ, паважаныя падпісчыкі! Свае прызы вы можаце атрымаць у рэдакцыі газеты «Звязда», пачынаючы з сённяшняга дня. Пры сабе неабходна мець дзейны пашпарт і падпісную квітанцыю. Праўда, па традыцыі, суперпрызы — халадзільнік «Атлант» і каляровыя тэлевізары «Віцязь» — супрацоўнікі «Звязды» даставяць яго наваспечаным уладальнікам па месцы пражывання ў найбліжэйшы час — падчас новай падпісной кампаніі — дзе ўручаць ва ўрачыстых абставінах у прысутнасці работнікаў РУП «Белпошта» і кіраўніцтва мясцовай «вертыкалі». Зрэшты, калі хтосьці не будзе мець магчымасці атрымаць у рэдакцыі мікрахвалевую печ альбо пыласос, то звяздоўцы, накіроўваючыся ў чарговую камандзіроўку, абавязкова знойдуць магчымасць даставіць іх вам дамоў.

Гуляйце і выйгравайце, заставайцеся са «Звяздою».

**Кар. «Звязды».**

*У панядзелак, 11 студзеня, адбыўся розыгрыш прызавога фонду рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», арганізатарам якой з'яўлялася ўстанова «Рэдакцыя газеты «Звязда», размешчаная па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.*

*Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 23 лістапада 2009 года (пасведчанне № 1597) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 25 лістапада 2009 года па 30 сакавіка 2010 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» першага квартала або першага паўгоддзя 2010 года.*

*Удзел у гульні прынялі 1607 падпісчыкаў газеты «Звязда». Прызавы фонд гульні разыграны поўнасцю.*

Прызы сярод удзельнікаў гульні размеркаваліся наступным чынам:

***электрафены FA-5564-1 выйгралі:***

**Шугай Людміла Іванаўна,** г. Кобрын,
**Шыла Валерый Міхайлавіч,** г.п. Бягомль,
**Шляева Таццяна Ягораўна,** Жлобінскі раён, в. Рэкта,
**Іванова Марыя Баляславаўна,** Карэліцкі раён, в. Зелянец,
**Пінчук Валянціна Апанасаўна,** г. Бабруйск,
**Ралько Анатоль Аляксеевіч,** г. Клецк,
**Плюто Рэгіна Мікалаеўна,** г. Мінск

***пыласосы Samsung VC 5853 SU3B/SBW выйгралі:***

**Сыцэвіч Марыя Аляксееўна,** г. Кобрын,
**Морхат Зоя Уладзіміраўна,** Шаркаўшчынскі раён, в. Залесін,
**Мартыненка Аляксей Якаўлевіч,** Брагінскі раён, в. Старая Іолча,
**Юшкевіч Галіна Міхайлаўна,** г. Навагрудак,
**Коржыч Любоў Аляксандраўна,** г. Хоцімск,
**Крывец Анатоль Ігнатавіч,** г. Івянец,
**Трунец Ніна Пятроўна,** г. Мінск

***тэлевізары «Віцязь» 54 стv720-7 выйгралі:***

**Невядомскі Уладзімір Васільевіч,** г. Драгічын,
**Печкурова Таццяна Міхайлаўна,** Віцебскі раён, в. Ноўка,
**Каралёва Лідзія Якаўлеўна,** г. Гомель,
**Станчык Павел Альбертавіч,** Іўеўскі раён, в. Магенцы,
**Шчамялёў Пётр Пятровіч,** Бялыніцкі раён, в. Пачапок,
**Балашко Леакадзія Канстанцінаўна,** г. Валожын,
**Масько Васіль Іванавіч,** г. Мінск

***мікрахвалевую печ Daewoo KOR-4115 SA выйграла***

**Бурнака Галіна Міхайлаўна,** Лагойскі раён, в. Крайск

***суперпрыз халадзільнік MXM 2835-90, РБ, ЗАТ «Атлант», выйграла***

**Белавус Людміла Мікалаеўна,** г. Верхнядзвінск.

***Тэлефон для даведак*** *па пытаннях правядзення рэкламнай гульні: (017) 287 19 68.*

# ЦІ ЗАБАРОНЯЦЬ БЕЛАРУСАМ ПАРКАВАЦЦА Ў ДВАРАХ?

**Па такім шляху пайшлі ўлады Масквы. У хуткім часе за паркоўку ў жылых дварах «белакаменнай» збіраюцца выпісваць штрафы. Карэспандэнт «Звязды» высвятляў, ці не чакае такі самы лёс беларускіх аўтааматараў.**

Расійскае новаўвядзенне шмат каго напалохала. Паркаваць аўтамабілі ў маскоўскіх дварах можна будзе толькі на спецыяльна адведзеных тэрыторыях — так званых гасцявых стаянках. Хапае такіх стаянак, як паказвае сучасная практыка, на два-тры пад'езды. Куды ж падацца іншым аўтааматарам?

Праблемы з паркоўкамі востра стаяць і ў Мінску, і ў іншых абласных цэнтрах Беларусі. Знайсці вольнае месца ў двары вечарам, калі аўтааматары вярнуліся з працы, сапраўдны падарунак. Шмат дзе людзі паркуюцца на бардзюрах, зялёных зонах, ледзьве не ставяць машыны адна на адну. Праблему рана ці позна трэба вырашаць. Ці не пойдуць гарадскія ўлады Мінска па слядах сваіх маскоўскіх калегаў?

Як патлумачылі карэспандэнту «Звязды» дасведчаныя людзі ў Мінгарвыканкаме, падобных планаў пакуль ніхто не абвяшчаў. А галоўная задача чыноўнікаў — набудаваць новых паркоўак па-за межамі двароў.

Раней будаваліся стаянкі слаба. З 600 тысяч сталічных аўтамабіляў палову сёння спрабуюць запаркаваць менавіта ў дварах. Таму і «хуткім дапамогам», і таксістам, і «смеццевозкам» часта складана патрапіць да патрэбнага пад'езда. Але згодна з «Праграмай па добраўпарадкаванні» на 2010 год, раённыя ўлады сталіцы прыняліся вырашаць праблему. Вось якім чынам.

*— Наш раён падзелены на 17 сектараў, у кожным з іх мы плануем пабудаваць па новай паркоўцы,* — **распавядае начальнік аддзела гарадской гаспадаркі адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска Павел САСІНОЎСКІ.** *— Адна з іх, на 100 месцаў, ужо збудаваная — на вуліцы Ложынская. Вельмі важна, каб мясцовыя жыхары былі зацікаўленыя ў такіх паркоўках. Гарадскому бюджэту цяжка пацягнуць такое будаўніцтва, таму ўкласці грошы ў стварэнне паркоўкі мы прапануем непасрэдна жыхарам раёна. Ім у сваю чаргу будзе гарантавана парковачнае месца. Людзі не толькі назаўсёды вырашаць сваю праблему, але і прымуць удзел у развіцці роднага раёна...*

Для арганізацыі паркоўкі аўтааматарам давядзецца скласціся на суму ад 600 тысяч рублёў да аднаго мільёна. Паркавачнае месца хоць і не будзе аформлена, як прыватная ўласнасць, але чыноўнікі гарантуюць, што, атрымаўшы пропуск, паркаваць сваё аўто на такой стаянцы можна будзе да скону.

У будучыні плануюцца будаўніцтвы шматпавярховых паркінгаў. Тут ужо ваша месца будзе аформлена як прыватная ўласнасць. Укласці ў яго давядзецца каля 4000 долараў ЗША.

А пакуль нахабных кіроўцаў, якія паркуюцца на бардзюрах, дзіцячых пляцоўках, а часам і «падпіраюць» машыны іншых, амаль немагчыма пакараць.

*— Вядома, такіх вадзіцеляў мы прыцягваем да адказнасці па артыкуле «Парушэнне правілаў прыпынку і стаянкі», але ёсць істотная праблема,* — **кажа кіраўніца прэс-службы ДАІ Мінгарвыканкама Жанна ТРАЙНО.** *— Толькі ў Мінску прыкладна 600 тысяч транспартных сродкаў, і працуе каля 700 інспектараў ДАІ. Выходзіць, што адзін наш супрацоўнік павінен сачыць амаль за тысячай адзінак транспарту. Ці магчыма ў такіх умовах пакараць усіх парушальнікаў?*

**Яўген ВАЛОШЫН.**

## «НАВАТ У ДВАРАХ ШАНХАЯ ПАРКАВАЦЦА ЛЯГЧЭЙ, ЧЫМ У МІНСКУ»

Прадпрымальнік **Гуанья Чжоў,** які шчыльна працуе з Беларуссю, расказаў карэспандэнту «Звязды», як нашы сябры-кітайцы вырашылі праблему з паркоўкамі ў дварах.

*— У маім родным Шанхаі жыве ад 17 да 20 мільёнаў жыхароў. У два разы болей, чым ва ўсёй Беларусі,* — падлічвае спадар ЧЖОЎ. — Ужо дзесяць гадоў таму ў нас кожны новы дом будаваўся з падземным паркінгам. Праўда, за паркінг трэба штомесяц плаціць. У Мінску я маю кватэру ў доме, які пабудавалі тры гады таму. І ў ім няма паркінгу. Гэта дзіўна. Таму і двары ў беларускай сталіцы забітыя аўтамабілямі. А кітайскія — не. Праўда, калі жыхар Шанхая ўсё ж хоча паркавацца ў двары, то можа. Толькі за гэта зноў жа трэба плаціць.

## МІНСКІЯ ПАРКОЎКІ ЗРАБІЛІ БЯСПЛАТНЫМІ. ЧАСОВА

Мінскія аўтааматары не паверылі сваім вачам, калі пасля навагодніх святаў аж 26 муніцыпальных парковак зрабілі бясплатнымі. Адначасова на іх могуць размясціцца 1500 аўто. А знаходзяцца паркоўкі ў самых стратэгічных пунктах — ля чыгуначнага вакзала, на плошчы Якуба Коласа і гэтак далей.

*— Раней аўтааматары плацілі за паркоўку так званы збор — 3200 рублёў за гадзіну,* — **тлумачыць дырэктар «Парковак сталіцы» Леанід ДАРАШЧОНАК**. *— Гэты збор быў уведзены на падставе Закона «Аб бюджэце», які прымаецца штогод. Мясцовым Саветам дазвалялася ўводзіць дадатковыя падаткі. У Мінску такім чынам быў уведзены збор за паркоўку. Новы Закон «Аб бюджэце» на 2010 год забараніў мясцовым заканадаўчым органам уводзіць падатак за паркоўку. Пакуль наша арганізацыя ў рэжыме чакання. Што будзе з «Паркоўкамі сталіцы», невядома. Магчыма, арганізацыя знікне.*

Тым не менш, іншыя чыноўнікі падкрэсліваюць, што стаянкі зрабілі бясплатнымі, хутчэй за ўсё, часова.

## ОРША АДЗНАЧЫЛА 100-ГОДДЗЕ ЗАСЛОНАВА

**У Оршы прайшлі мерапрыемствы ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння знакамітага падпольшчыка і партызана Канстанціна Заслонава.**

Прама ля чыгуначнага палатна ля вакзала, дзе стаіць помнік Заслонаву, правялі мітынг-рэквіем. Ганаровая варта салютавала ў памяць аб гэтым выдатным чалавеку, які аддаў жыццё за вызваленне краіны. Жыхары горада ўсклалі кветкі да помніка. У мемарыяльны музей яго памяці пускалі ў гэты дзень бясплатна. Арганізавалі таксама тэматычную навукова-практычную канферэнцыю, сустрэчы з ветэранамі вайны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## АХВЯРЫ ПАЛЯВАННЯ

**Два чалавекі атрымалі раненні на паляванні ў мінулыя святочныя дні, — паведамляе начальнік аддзела ўпраўлення прафілактыкі і аховы правапарадку УУС Гомельскага аблвыканкама Сяргей Шапецька.**

У Лельчыцкім раёне пры спробе загнаць ваўка ў прыцемках 36-гадовы паляўнічы выпадкова аказаўся на шляху карцечы, выпушчанай па кустах яго напарнікам, які думаў, што цэліць у звера. Мужчына атрымаў раненні шыі і рукі. Ён шпіталізаваны і прааперыраваны.

У Петрыкаўскім раёне ў зону палявання на кабана бліжэй да вечара прыйшоў 14-гадовы падлетак з вёскі Бабунічы – сын егера, адказнага за правядзенне палявання. Бацька сказаў хлопцу, каб ён ішоў дадому, але юнак заблытаўся і выйшаў якраз на нумар, дзе быў паляўнічы. Той, мяркуючы, што за кустамі сякач, зрабіў стрэл са стрэльбы ТОЗ-34 12 калібра ў бок хлопца. З раненнем галавы, шыі і перадплечча падлетак знаходзіцца ў бальніцы. Па абодвух фактах праводзіцца праверка.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

13
СТУДЗЕНЯ
2010 г.
СЕРАДА
№ 1 (15604)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# НАМ БЫ Ў НЕБА!

Роўна сто гадоў таму, у 1910 годзе, у Расіі прайшлі першыя спаборніцтвы авіямадэляў. Тады самы далёкі пералёт склаў сямнаццаць метраў. У дні школьных канікулаў юныя авіямадэлісты Рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці навучэнцаў сустрэліся на спаборніцтвах «Дальні пералёт-2010», каб паспрабаваць пабіць даўнія рэкорды. Удзельнікі прайшлі два этапы: тэарэтычны конкурс на веданне пытанняў авіяцыйнай і ракетнай тэматыкі, а таксама ўзялі ўдзел у спаборніцтвах з мікрамадэлямі на дальнасць пералёту.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



Журналіст мяняе прафесію

# КАНДЫДАТЫ Ў МАДЭЛІ:

## Як я трапіў у мадэльную школу і даведаўся, што такое ахвярнасць

**З таго часу, як на мадэльным небасхіле Беларусі заззялі зоркі Кацярыны Даманьковай, Вікторыі Махоты, Марыі Есьман, толькі ляніві не цікавіцца навінамі моды. А дзякуючы такім конкурсам, як «Міс Інтэркантыненталь» ці «Міс Беларусь» цікавасць гэта толькі ўзрастае. Асабіста я не фанацею ад тэндэнцый-2010 і не хачу ведаць, у шапцы якога колеру варта хадзіць гэтай зімой. Мяне заўсёды цікавіла, як жывуць самі мадэлі: як трапляюць у мадэльныя школы, як у іх праходзяць рэпетыцыі, першыя паказы, першыя заробкі... А яшчэ — як у гэтым дзявочым свеце выжываюць мадэлі-мужчыны.**

Рыхтуючыся да эксперыменту, я перачытаў шмат матэрыялаў пра мадэляў і іх жыццё. І прыйшоў да высновы: каб цалкам зразумець «мадэльную кухню», трэба зазірнуць за яе кулісы. Калі мадэлі не ведаюць, што іх канкурэнт па подыуме — насамрэч журналіст, і паводзяць сябе як звычайна, вось тады і выплываюць найбольш цікавыя рэчы, пра якія не прачытаеш ні ў адным інтэрв'ю. Каб разабрацца ў тонкасцях мадэльнага бізнэсу, пад выглядам патэнцыйнай мадэлі я паступіў у адну з вядучых мадэльных школ сталіцы. Занатоўваючы свае назіранні, тры шматпакутныя месяцы мне давялося спасцігаць мастацтва дэфіле, асновы касметыкі і фотатрэнінгу.



### Прыгажосць і гламур

Сярод мадэльных школ доўга не выбіраў: дастаткова было рэпутацыі і інтэрв'ю кіраўнікоў школ газетам. Дырэктар адной з іх хваліў сваю школу больш за астатніх, гэта і прадвызначыла мой выбар.

Апрануўшыся ў самае лепшае, зрабіўшы фірмовы начос і начысціўшы туфлі, я выправіўся на знаёмства з аб'ектам. На святлафоры перада мной намалявалася даўганогая старлетка. Валасы-блонд, спадніца-міні і ўся палітра румянаў на твары. Чамусьці адразу стала зразумела: дзяўчына, як і я, кіруе на арганізацыйны збор. Я яшчэ не здагадваўся, што амаль усе дзяўчаты, якіх я ўбачу ў той вечар, будуць выглядаць амаль гэтак.

На ганку мадэльнай школы — зграбныя станы чатырнаццацігадовых дзяўчатак. Юныя німфы курылі цыгарэты «Glamour», стараючыся нават брутальны дым выдыхаць па-даросламу.

Крэслы актавай залы цешылі вока фіялетавай гамай: гламурна, але сціпла. Менавіта сюды прыходзілі ў чаканні і надзеі: з мамамі, татамі, братамі, бабулямі... На тварах толькі і чыталася: «А, вы таксама на збор прыйшлі? І мы. Не, мы так, выпадкова зусім. Паглядзець, паслухаць, раптам атрымаецца што...» Але пры першым жа поглядзе на іх нафуфыраную дзятву было зразумела, што ніякай выпадковасцю тут не пахла.

Да афіцыйнага пачатку заставалася яшчэ хвілін пятнаццаць, і паток людзей усё прыбываў. У большасці гэта былі дзяўчаты. Млява, па-лебядзінаму, на высокіх абцасах, яны выкрочвалі па вузкіх праходах паміж крэсламі і гэтак жа лёгка апускаліся на свае месцы. Стук абцасаў паступова сціхаў, узнаўляючыся пры падыходзе новай партыі намарафечаных.

Будучыя мадэлі збольшага былі дзяўчаткамі да 16-ці, іх узрост выдавалі моцна нафарбаваныя вусны. На выгляд — усе як адна, адрозніваліся хіба што прылізанымі ў кожнай на свой капыл валасамі. Не схлушу, траплялося сярод прысутных і сапраўдныя кветкі — я б іх адразу ў Парыж на Тыдзень моды адправіў бы. Але мае назіранні абмяжоўваліся свецкім мысленнем у межах «прыгожая — не прыгожая». Прафесіяналы ж, як высветлілася пазней, увагу ў першую чаргу звяртаюць на фігуру і майстэрства дэфіле.

— Глянь, глянь, гэта ж трэба — шпала якая, — не абмінула «пахваліць» адну з дзяўчат брунэтка з шэрагу перада мной.

— Анарэксія! Стопудова, — адрэдагавала сяброўка.

### Добрая світа — па кім будзе пашыта?

— Мы вас чакалі, — першы сказ, з якім звярнуўся да нас кіраўнік агенцтва Максім, надаваў упэўненасці, а другі — крылы. — Вы нам патрэбныя! Так-так, я не агаворваюся: нам патрэбныя мадэлі. На паказах у Беларусі, Расіі, Францыі, Германіі, Італіі. Вы зрабілі правільны выбар, што прыйшлі да нас...

Ад названых краін кружылася галава і мроілася стэрэатыпная карцінка шчасця: фотасесіі, фатографы, дызайнеры, прыгожае адзенне... Грошы, зразумела. Трэба было бачыць у гэты момант твары матуль і бабуль — яны расплываліся ва ўсмешках і ўжо бачылі лёсы сваіх дочак такімі, як у Наташы Вадзянавай, якая харчавалася на дэгустацыях, апраналася на распродажах, а пасля выйшла замуж за багатага прынца. Толькі мужчыны-бацькі сядзелі надзьмутымі, быццам за дочак ім абяцаюць калым.

Далей нас прасвятлілі наконт таго, па якіх прадметах і па якіх днях будуць праходзіць заняткі, якія ўзроставыя катэгорыі і расцэнкі існуюць у школе.

— Прафесія мадэлі ў наш час дастаткова папулярная. Але не забывайцеся: мадэль — гэта найперш дэманстратар адзення. Мы навучым вас хадзіць. Наноў. Вы павінны разумець, дэфіле — асаблівае майстэрства, якому трэба вучыцца. Праз тры месяцы найлепшыя з вас будуць адабраныя да нас у агенцтва, і вы станеце нашымі мадэлямі. Мы працуем як з дарослымі, так і з маладымі мадэлямі (дзіцячая катэгорыя).

Затым на сцэну запусцілі тых, хто ў тым агенцтве ўжо займаўся. Яны паказвалі нам, зялёным летуценнікам, чаму мы павінны будзем навучыцца за тры месяцы. І калі з дзяўчатамі тут больш-менш было зразумела (ганарлівая і незалежная постаць, паходка ад сцягна), то з хлопцамі заставаліся пытанні: некаторыя з іх стваралі ўражанне фанеры, падсушаных «качкоў», якія, быццам не еўшы два дні, сноўдаліся на сцэне...

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Клуб юнкараў

# ФОРМА І ЗМЕСТ

## Пінжак ці майкі-байкі?

**Прайшло чатыры гады як у мінскіх школах была ўведзена абавязковая школьная форма, але спрэчкі вакол неабходнасці апошняй не сціхаюць і сёння.**

Паводле меркавання многіх вучняў маёй школы, форма не патрэбна наогул. Пераважна па трох прычынах. Па-першае, школьная форма ў цэлым не адпавядае, так бы мовіць, духу падлеткаў, для якіх адзенне — найбольш яскравы спосаб самавыражэння. Асабліва калі маладыя людзі адносяць сябе да той ці іншай субкультуры. Прасцей кажучы, калі ты з'яўляешся аматарам пэўнага напрамку ў музыцы, то гэта патрабуе ад цябе адпаведнай манеры апранацца. Класічнаму пінжаку са штанамі тут не месца. Таму на практыцы ў шэрагу выпадкаў мы маем наступнае: вучні проста ігнаруюць заўвагі школьнай адміністрацыі і ўпарта апранаюць у школу тое, што даспадобы.

Па-другое, школьную форму даволі цяжка назваць зручнай, утульнай, такой, якую б сапраўды хацелася насіць і ў дачыненні да якой слова «камфорт» было б дарэчным. Вясной у гэтым «гардэробе» горача, а зімой бывае холадна. Калі ж апранаеш форму пасля фізкультуры, яна непрыемна ліпне да цела і «шчыплецца», што надта раздражняе.

Нарэшце, нельга назваць здавальняючым кошт формы. Ва ўсякім выпадку, джынсы, некалькі футболак і байка могуць абысціся танней. Прычым вось такі гардэроб не будзе дастаўляць дыскамфорт, і да канца навучальнага года амаль не страціць нармальнага выгляду, чаго не скажаш пра школьную форму.

Прыхільнікі апошняй асноўным довадам «за» лічаць тое, што звычайнае адзенне адцягвае ўвагу вучняў ад працэсу навучання. Сапраўды, калі на апошняй парце сядзіць... паўголая новенькая дзяўчына, верагоднасць таго, што моцная палова класа будзе глядзець на дошку, істотна зніжаецца. Наступным аргументам «за» звычайна называюць адсутнасць матэрыяльнай забяспечанасці сярод вучняў. Напрыклад, нехта мяняе майкі-байкі штодня, а нехта ходзіць у адной і той жа рэчы круглы год. Мяркуецца, гэта здольна нанесці шкоду псіхалагічнаму стану падлеткаў, а значыць, можа адбіцца на паспяховасці.

У апошні час рэкамендацыі адносна школьнай формы сталі менш жорсткімі. Цяпер рэкамендуецца вытрымліванне «дзелавога стылю». Так што вучні могуць апрануць, напрыклад, джэмпер, але выгляд пры гэтым павінен заставацца строгім. Наколькі строгім, — гэта вызначае адміністрацыя асобна ўзятай навучальнай установы. Так, у адных школах рэкамендацыю лічаць правілам, а ў іншых — хутчэй, парадай. Да ліку станоўчых зменаў у нашай тэме можна аднесці і значнае пашырэнне выбару ў апошнія гады, чаго не назіралася яшчэ некалькі гадоў таму.

Мне і вялікай колькасці маіх знаёмых найлепшым варыянтам здаецца не адмяняць форму ў прынцыпе, а зрабіць яе, скажам... рознай для кожнай школы. Такая практыка даўно выкарыстоўваецца, напрыклад, у Вялікабрытаніі, дзе да пачатку навучальнага года вучні набываюць форму ў сваёй жа школе. Кожная ўстанова выбірае свой колер, свае дэталі для такога адзення. Знаходзіцца на ім і месца для выявы школьнага герба. Што характэрна, пры распрацоўцы школьнай формы ўлічваецца меркаванне дзяцей. Безумоўна, у такім выглядзе форма будзе аб'ядноўваць і ўмацоўваць дух вучняў. І, як вынік, — дапамагаць дзецям і падлеткам добра вучыцца.

Пакуль, наколькі мне вядома, у нашай краіне не плануюцца змены ў дачыненні да школьнай формы. Рэкамендацыі застаюцца рэкамендацыямі. Для адных — парадай, для іншых — правілам. Але, думаю, вучнёўская моладзь была б не супраць нейкіх зменаў. У сэнсе, да лепшага.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ, вучань СШ № 105 г. Мінска.**

# ВАРАЖБА ПА-СТУДЭНЦКУ

**Стары Новы год (13 студзеня) для сучасных беларусаў гэта апошняя кропка ў чарадзе зімовых святаў. Апошняе калядна-навагодняе свята. Раней менавіта ў гэты дзень дзяўчаты высвятлялі свой дзявочы лёс. Калі выпадзе выйсці замуж, як нарачонага будуць зваць, добры мужык ці п'яніца. Для гэтага нашы бабулі хадзілі на скрыжаванні, пускалі ў пакой пеўня і г.д. Як высветлілася, цяперашнія дзяўчаты таксама не грэбуюць варажбой на калядныя святы. Якім чынам адбываецца гэты старажытны абрад у студэнцкім інтэрнаце БДУ, чытайце ніжэй.**

### «Першы мужчына, імя якога мы спыталі, нас абмацюкаў»

— Да жыцця ў студэнцкім інтэрнаце я ніколі не варажыла, — расказвае жыхарка студэнцкага інтэрната БДУ № 10 Ліза Цімашэнка. — А ў дзяўчат з блока была такая традыцыя. Я толькі вось з імі пачала варажыць.

Дзяўчаты налівалі ваду ў зялёны абшарпаны інтэрнатаўскі тазік, а па краях клалі паперкі з рознымі пажаданнямі кшталту «здароўя», «багацця», «кахання» і г.д. На сярэдзіну таза ў ваду кладзецца акуратна свечка. Пасля ўсе, затаіўшы дыханне, глядзяць, куды яна паплыве і якую паперку падпаліць. Галоўнае, параілі дзяўчаты, пачынаць з самай старэйшай, бо ёй жа перш за ўсё трэба замуж.

— Часам бывае, праўда, што гэтыя свечкі не рухаюцца ні халеры, — кажа суседка Лізы Віка. — І тады ўсе дзяўчаты хорам паўтараюць: «Рухай яе вачыма! Рухай яе вачыма!». Ты ненавідзіш увесь свет і хочаш, каб гэта ўсё хутчэй скончылася. Самае цікавае, што абавязкова ёсць некалькі непажаданых паперак, якія абавязкова чамусьці выпадаюць.

— У мінулым годзе так сталася, што тром маім сяброўкам і мне таксама выпалі паперкі «цяжарнасць», — смяецца Віка. — Ніхто не зацяжараў, і толькі адна з нас засмуцілася з-за таго, што гэтага не адбылося.

Аднойчы дзяўчаты па адным старым звычаі выйшлі, каб у першага сустрэчнага мужчыны спытаць яго імя.

— Гэта было ў тры гадзіны ночы, — расказвае Алена. — Мы ўсім блокам пайшлі ў корпус «Б». Там у нас жывуць пераважна радыёфізікі, таму хлапцоў там больш, чым у нашым «Г». І ў тры гадзіны ночы нам сустрэўся малады чалавек, які нёс выкідваць смецце.

— Я толькі выходжу — і ён мне насустрач, — перабівае Лізавета. — Радасна падбягаю, пытаюся, як яго імя. Ён паглядзеў на мяне, нібыта на дурную. Пасля мы ўшасцёх падбеглі, сталі пытацца, а ён нас так абмацюкаў! Не вельмі прыемны досвед атрымаўся.

### Адзін нарачоны на трох

Выкарыстоўваюць дзяўчаты такі стары правераны метад, як заручальны пярсцёнак на валаску.

— Трэба вырваць валасок са сваёй галавы прывязаць яго да пярсцёнка, — дзеліцца прабабкавым рэцэптам Вікторыя Церашонак. — У шкланку наліваецца гарэлка. Палова кубка недзе. Руку ўстойліва зафіксаваць на стале. Пярсцёнак пачынае хітацца і біцца аб сценкі. І я да гэтага часу не разумею, як гэта адбываецца. Калі я варажыла, пярсцёнак спачатку стукнуўся разоў дзесяць, пасля заціх, потым ізноў пачаў хістацца. Так мне настукаў ён дваццаць тры разы. Пакуль мне дваццаць, таму праверыць, сапраўдны гэты спосаб ці не, не маю магчымасці.



Суседка Вікі Ліля распавяла пра іншы метад варажбы на стары Новы год. Трэба сесці на адну з трох падушак. Пад першай ляжаць грошы. Гэта значыць, замуж з-за грошай выйдзеш, пад другой — пярсцёнак, значыць, па каханні, а пад трэцяй — пуста, значыць з-за таго, што зацяжарыш.

Таксама варажба ў горадзе абумоўлена спецыфічнымі асаблівасцямі. Аднойчы дзяўчаты, каб высветліць, хто ж будзе іх нарачоным, выкінулі па адной сваёй старой рэчы з акна. А жылі яны тады на адзінаццатым паверсе. Па тэхналогіі варажбы, хто падыме якую-небудзь рэч, той і будзе нарачоным яе ўласніцы . І ўсе рэчы ўпалі на дах аўтамабіля, што стаяў пад акном. Чый гэта нарачоны і як яго дзяліць? Бабулі і прабабулі не даюць адказу на гэтае пытанне.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

### «КЛІМАТ ЗМЯНЯЕЦЦА. А ТЫ?»

**Акцыя пад такой назвай прайшла ў экалагічнай гімназіі №19 Мінска.**

У рамках акцыі ў гімназіі быў арганізаваны конкурс дзіцячых малюнкаў, плакатаў, коміксаў, флаераў па тэматыцы зніжэння «вугляроднага следу». Таксама адбыўся дзіцячы тэатралізаваны паказ у касцюмах, выраблены з бытавых адходаў і прыродных матэрыялаў. Пераможцы дзіцячых конкурсаў і ўдзельнікі экалагічных праектаў былі ўзнагароджаныя прызамі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# СПАБОРНІЦТВЫ ЮНЫХ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

8500 тысяч школьнікаў з усіх рэгіёнаў Беларусі ўдзельнічаюць у абласных і мінскім гарадскім турах рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, якія стартавалі 11 студзеня. Трэба заўважыць, што менавіта абласныя туры рэспубліканскай алімпіяды даюць у нашай краіне неафіцыйны старт прыёмнай кампаніі, паколькі ўладальнікі дыпломаў першай ступені абласных алімпіяд атрымліваюць аўтаматычна 100 балаў па адпаведным прадмеце пры паступленні ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, а таксама пуцёўку на ўдзел у заключным, рэспубліканскім, туры алімпіяды. А ўжо пераможцы рэспубліканскай алімпіяды аўтаматычна становяцца студэнтамі.

Рэспубліканская школьная алімпіяда праводзіцца па 16 вучэбных дысцыплінах, у тым ліку па працоўным навучанні. Для прыкладу, удзельнікам алімпіяды па беларускай і рускай мове і літаратуры даводзіцца рыхтаваць вуснае выказванне, пісаць водгук і комплексную работу. Спаборніцтвы па замежнай мове складаюцца з лексіка-граматычнага тэста, аўдзіравання і кантролю за навыкамі маўлення. На спаборніцтвах па фізіцы прадугледжаны два туры: тэарэтычны і эксперыментальны. На алімпіядзе па працоўным навучанні акрамя практычнага і тэарэтычнага тура школьнікі будуць абараняць яшчэ і свае творчыя праекты. На спаборніцтвах па астраноміі, хіміі, біялогіі і геаграфіі ёсць тэарэтычны і практычны тур. Навінкай для абласных алімпіяд стала ў мінулым годзе арганізацыя дадатковага англамоўнага тура на алімпіядзе па геаграфіі, па выніках якога адбіраліся школьнікі, якія нядрэнна ведаюць англійскую мову, для наступнай іх падрыхтоўкі да міжнароднай алімпіяды па геаграфіі, якая пройдзе ў 2010 годзе. Гэта адзіная міжнародная алімпіяда, якая праводзіцца толькі на англійскай мове. Менавіта веданне англійскай мовы і было раней самым «слабым месцам» у членаў беларускай зборнай. Таму ў гэтым годзе практыка правядзення дадатковага англамоўнага тура атрымала працяг.

Плошчы для правядзення абласных алімпіяд выдзелілі гімназіі, школы, ліцэі і каледжы, а месцам урачыстага іх адкрыцця сталі Дамы дзіцячай творчасці, Палацы культуры, цэнтры пазашкольнага выхавання. А на Гомельшчыне адкрыццё абласнога тура алімпіяды адбылося ў сценах Гомельскага дзяржаўнага цырка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Выпрабавана на сабе

# СЕТКІ ВЯЛІКІХ КАМБІНАТАРАЎ XXI СТАГОДДЗЯ,

## або Як я працавала ў сеткавым маркетынгу

Ведаеце, у мяне ўжо даўно сабралася вялікая колькасць розных паперак з запрашэннямі на працу, выключна «перспектыўную» і толькі для «сур'ёзных і актыўных людзей». Стала цікава, што ж хаваецца за гэтымі хай і неперакanаўчымі, але вельмі прывабнымі словамі. А яшчэ мяне часта пачалі спыняць у пераходах або проста на вуліцы з прапановай запоўніць нейкую анкету і пакінуць свае каардынаты. Сёння многа гаворыцца аб крызісе, аб скарачэннях. А на распаўсюджвальнікаў або, як яны самі сябе называюць «дыстрыб'ютараў» попыт паранейшаму высокі, сеткавы маркетынг гатовы прыняць у свае шэрагі кожнага. Сёння запрашаюць працаваць сеткавіком не толькі на вуліцы. Інтэрнэт напоўнены аб'явамі аб вакансіях, але пра тое, у чым заключаецца праца, у іх не гаворыцца. Я вырашыла паспрабаваць сябе ў ролі распаўсюджвальніка.

— Алё, добры дзень, я па аб'яве тэлефаную. Якую працу вы прапаноўваеце? — набрала я нумар з паперкі з запрашэннем «да супрацоўніцтва», якая першая трапіла пад руку.

На жаль, з тэлефоннай гутаркі я мала аб чым даведалася:

— Я менеджар вялікай кампаніі, якая пастаўляе ў Беларусь касметыку, — сказалі мне. — Аб нашай прапанове лепш за ўсё будзе пагаварыць пры асабістай сустрэчы. Калі вам будзе зручна пад'ехаць у наш сэрвісны цэнтр?

...На наступны дзень я ўжо бадзёра крочыла па незнаёмай мне вуліцы, перапытваючы ў людзей, як мне трапіць да патрэбнага будынка. На першым паверсе да мяне падышла Таццяна (так звалі майго «працадаўцу»), дзяўчына гадоў дзевятнаццаці, апранутая ў звычайны швэдар і джынсы, увогуле, не была яна падобная на менеджара вялікай замежнай кампаніі. Таццяна прапанавала мне прагуляцца па сэрвісным цэнтры. Пакуль мы хадзілі па розных аддзелах, яна тлумачыла мне, у чым будзе заключацца праца. І пачала, вядома, з прыемнага — з перспектыў велізарнага прыбытку і кар'ернага росту.

— Толькі ў нашай кампаніі вы зможаце зарабляць вялікія грошы, не прыкладаючы пры гэтым асаблівых намаганняў! А ведаеце, што адрознівае працу ў нас ад працы ў дзяржаўнай фірме? Гэта тое, што вы самі плануеце і вырашаеце, колькі можаце зарабіць, не азіраючыся ні на які аклад, — нібы акторка гутарковага жанру, Таццяна пачала распісваць перада мной неверагодныя магчымасці.

Падчас нашай прагулкі па сэрвісным цэнтры мы ўвесь час бачылі велізарныя чэргі.

— Вы ўкладаеце ў свой бізнэс капейкі, а з часам будзеце атрымліваць каласальныя прыбыткі! Згаджайцеся!

— Дык усё-такі, у чым жа сутнасць маёй працы? — не ўнімалася я.

— Усё вельмі проста! Вам неабходна прапаноўваць прадукцыю людзям і запрашаць іх да супрацоўніцтва з нашай кампаніяй. Чым больш у вашай структуры будзе людзей, тым больш грошай вы будзеце зарабляць.

Ну, як тут было не пагадзіцца? Работа не пыльная, 2-3 гадзіны ў дзень, мне як кансультанту кампаніі — 30%-скідка на ўсю прадукцыю і плюс да гэтага немаленькая зарплата. Безумоўна, я пагадзілася.

Я стала кансультантам кампаніі ўсяго за... паўгадзіны, і спатрэбіліся мне для гэтага толькі пашпарт і дванаццаць тысяч беларускіх рублёў.

— Віншую! Вы адкрылі для сябе неверагодныя магчымасці. Нам засталося толькі скласці ваш план працы, — урачыста вымавіла Таццяна.

Увечары, праглядаючы каталог з прапанаванай прадукцыяй, я пачала абзвоньваць сяброў і знаёмых. Але чамусьці прапанова набыць у мяне суперкласную касметыку не выклікала ў іх асаблівага захаплення.

— Ну, пакуль мне нічога не трэба з касметыкі, ды і з грашыма цяпер праблема. Крызіс на двары, — адказы прыкладна такога кшталту чула я з тэлефоннай трубкі.

Тут і прыйшло маё першае расчараванне.... Але на наступны дзень мяне супакоіла Таццяна:

— Гэта нармальна. Вам трэба звыкнуцца з тым, што будуць і адмовы, не хвалюйцеся, мы навучым вас правільна прапаноўваць людзям прадукцыю. А сёння па плане ў нас выезд на анкеты, не здзіўляйцеся, — Таццяна, убачыўшы, што я не зусім разумею, пра што яна гаворыць, паабяцала: — Я вам усё пакажу.

А «анкетаваць» мы паехалі на адну са станцый метро, дзе Таццяна пазнаёміла мяне з яшчэ адной дзяўчынай з нашай структуры — Вольгай. Як высветлілася, Вольга ў гэтым бізнэсе ўжо не першы год і з'яўляецца дырэктарам, а на маё пытанне, ці вучыцца або працуе яна дзе-небудзь яшчэ, Вольга з усмешкай адказала:

— Ад працы ў кампаніі я атрымліваю такое задавальненне, што нідзе больш працаваць не збіраюся. Не, я, вядома, вучуся на завочным аддзяленні ўніверсітэта, але гэта толькі для бацькоў, якія мараць, каб у іх дачкі была вышэйшая адукацыя.

Тым часам мы пачалі анкетаваць людзей, якія праходзілі міма. Спачатку я толькі назірала за тым, як Таццяна і Вольга спыняюць іх (праўда, мала хто спыняўся) і просяць запоўніць анкету. А ў ёй былі прыкладна такія пытанні: «Ці карыстаецеся вы прадукцыяй кампаніі? Ці падабаецца яна вам? Ці не жадалі б вы стаць кансультантам?» І два апошнія, абавязковыя пытанні: «Колькі вам гадоў?» і «Ваш нумар тэлефона». Прыйшла і мая чарга.... З 10 спыненых мной чалавек запоўніла анкету толькі адна жанчына! Большасць людзей, убачыўшы назву маёй кампаніі, казала, што яны ўжо кансультанты.

Такіх выездаў на «анкетаванне» было яшчэ тры. Асаблівых вынікаў яны не далі, калі не лічыць аднаго зарэгістраванага чалавека і ангіны, якая паклала мяне ў ложак на два тыдні. Тут і надышло маё другое расчараванне, якое парвала маё супрацоўніцтва з кампаніяй па продажы касметыкі.

Безумоўна, ва ўмовах любога крызісу існуе праблема беспрацоўя, а сеткавы маркетынг гатовы прыняць у свае шэрагі кожнага. Для такой працы не трэба мець высокай адукацыі, няма абмежаванняў па ўзросце і поле, плюс да гэтага — вольны графік працы.

Памятаеце Астапа Бэндэра, які ведаў чатырыста спосабаў адбірання грошай? Сённяшнія вялікія камбінатары ведаюць такіх спосабаў значна больш, таму варта добра падумаць, перш чым ўблытвацца ў іх сеткі....

**Аксана ПУПАЧ.**

### І ЗЕФІР У ШАКАЛАДЗЕ

Упершыню віцебскія студэнты з Шры-Ланкі гулялі ў боўлінг і атрымалі трэцяе месца на турніры, арганізаваным БРСМ. Замежныя студэнты назвалі сваю дружную каманду «Зефір у шакаладзе». Безумоўна, такія акцыі спрыяюць большаму ўзаемаразуменню студэнтаў розных краін. Акрамя таго, замежнікі, як і нашы студэнты — будучыя тэхнолагі, паўдзельнічалі ў акцыі «Ёлачны бум», яны прынеслі ёлачныя цацкі, каб перадаць іх у дзіцячы дом.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯЎ І ЗМЯНЕННЯЎ У НЕКАТОРЫЯ ЗАКОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫБАРАЎ І РЭФЕРЭНДУМАЎ І АБ ПРЫЗНАННІ СТРАЦІЎШЫМ СІЛУ ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ВЫБАРАХ І ПРАВЯДЗЕННІ РЭСПУБЛІКАНСКІХ РЭФЕРЭНДУМАЎ»

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 11 снежня 2009 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 17 снежня 2009 года*

***(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 12 студзеня)***

18. Назву главы 12 дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «. Разгляд зваротаў».

19. У артыкуле 49:

у частцы пятай слова «шостай» замяніць словам «сёмай»;

частку шостую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Пры перавышэнні гранічнага памеру выдаткоўвання сродкаў выбарчага фонду кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь больш чым на 50 базавых велічынь, а кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў больш чым на 15 базавых велічынь або выкарыстанні кандыдатам у гэтых жа памерах грашовых сродкаў, акрамя сродкаў выбарчага фонду, Цэнтральная камісія, акруговая выбарчая камісія могуць без папярэджання адмяніць рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата.»;

частку сёмую выключыць.

20. Дапоўніць Кодэкс артыкулам 49[1] наступнага зместу:

**«Артыкул 49[1]. Парадак і тэрміны разгляду зваротаў аб парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі**

Звароты аб парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі, якія паступілі ў камісіі, дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі, разглядаюцца ў трохдзённы тэрмін з дня паступлення звароту, а звароты, якія паступілі ў дзень выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі, — неадкладна. Звароты, у якіх утрымліваюцца звесткі, што патрабуюць праверкі, разглядаюцца не пазней чым у дзесяцідзённы тэрмін з дня паступлення.

Заяўнік мае права знаёміцца з матэрыяламі, звязанымі з разглядам яго звароту.

Скаргі на рашэнні камісій разглядаюцца на пасяджэннях камісій. Аб даце, часе і месцы правядзенні пасяджэння паведамляецца заяўніку, які мае права прысутнічаць пры разглядзе скаргі.

Камісія, разгледзеўшы скаргу, прымае адно з наступных рашэнняў:

адмяніць рашэнне, якое абскарджваецца, цалкам або ў частцы і прыняць рашэнне па сутнасці;

адмовіць у задавальненні скаргі;

пакінуць скаргу без разгляду, калі заяўнікам не захаваныя парадак або тэрміны падачы скаргі, вызначаныя гэтым Кодэксам.

Вышэйстаячая камісія мае права пры неабходнасці разгледзець зварот па пытанні, якое адносіцца да кампетэнцыі ніжэйстаячай камісіі.».

21. Частку другую артыкула 52 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Бюлетэнь для галасавання выдаецца выбаршчыку, удзельніку рэферэндуму членам участковай камісіі на падставе спісу грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, пасля прад'яўлення пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь або іншага дакумента, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй. Пры атрыманні бюлетэня выбаршчык, удзельнік рэферэндуму распісваецца ў адпаведнай графе названага спісу.».

22. У артыкуле 53:

пасля часткі другой дапоўніць артыкул часткамі наступнага зместу:

«У першы дзень датэрміновага галасавання скрынкі для галасавання пламбіруюцца або апячатваюцца ў парадку, прадугледжаным часткай трэцяй артыкула 51 гэтага Кодэкса.

У перыяд датэрміновага галасавання штодзень пасля заканчэння часу правядзення галасавання старшыня або намеснік старшыні ўчастковай камісіі заклейвае прарэз для апускання бюлетэняў у скрынцы для галасавання аркушам паперы. Старшыня або намеснік старшыні і член участковай камісіі ставяць подпісы на гэтым аркушы. Раскрыццё прарэзу для апускання бюлетэняў у скрынцы для галасавання ажыццяўляецца штодзень перад пачаткам датэрміновага галасавання старшынёй або намеснікам старшыні ўчастковай камісіі. Пры заклейванні і раскрыцці прарэзу для апускання бюлетэняў у скрынцы для галасавання маюць права прысутнічаць назіральнікі, замежныя (міжнародныя) назіральнікі, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі. Захоўванне скрынкі для галасавання забяспечваецца старшынёй участковай камісіі.

У перыяд датэрміновага галасавання штодзень старшыня або намеснік старшыні ўчастковай камісіі складае пратакол, у якім пазначаюцца колькасць бюлетэняў, атрыманых участковай камісіяй, колькасць грамадзян, якія атрымалі бюлетэні для галасавання (у апошні дзень датэрміновага галасавання — агульная колькасць грамадзян, якія атрымалі бюлетэні для галасавання), колькасць сапсаваных бюлетэняў і колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў. Пратакол падпісваецца старшынёй або намеснікам старшыні і членам камісіі. Копія пратакола вывешваецца для ўсеагульнага азнаямлення ў памяшканні ўчастковай камісіі.»;

часткі трэцюю і чацвёртую лічыць адпаведна часткамі шостай і сёмай;

дапоўніць артыкул часткай восьмай наступнага зместу:

«Датэрміновае галасаванне не праводзіцца на ўчастках для галасавання, утвораных у санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых стацыянарных лячэбна-прафілактычных установах, а таксама перад другім турам галасавання.».

23. У частцы другой артыкула 54:

абзац трэці выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«члены ўчастковай камісіі атрымліваюць бюлетэні і распісваюцца ў іх атрыманні. Колькасць бюлетэняў, якія выдаюцца, павінна адпавядаць колькасці наяўных просьбаў выбаршчыкаў, удзельнікаў рэферэндуму;»;

абзац чацвёрты выключыць;

абзац пяты лічыць абзацам чацвёртым.

24. У артыкуле 55:

трэці сказ часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі: «Перад распячатваннем скрынак для галасавання падлічваецца і абвяшчаецца колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў, якія затым пагашаюцца, складваюцца ў пакеты і апячатваюцца.»;

частку другую дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «Вынікі падліку галасоў абвяшчаюцца старшынёй камісіі.»;

у частцы шостай:

абзацы другі і трэці пасля слоў «якія ўзялі ўдзел у галасаванні» дапоўніць словамі «, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі удзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання»;

абзац чацвёрты пасля слоў «якія ўзялі ўдзел у галасаванні» дапоўніць словамі «, у тым ліку колькасць удзельнікаў рэферэндуму, якія ўзялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць удзельнікаў рэферэндуму, якія ўзялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць удзельнікаў рэферэндуму, якія ўзялі удзел у галасаванні ў дзень рэферэндуму ў памяшканні ўчастка для галасавання»;

у частцы дзясятай:

першы сказ выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Пасля завяршэння падліку галасоў праводзіцца пасяджэнне ўчастковай камісіі, на якім вызначаюцца і заносяцца ў пратакол вынікі падліку галасоў.»;

дапоўніць частку сёмым сказам наступнага зместу: «На пасяджэнні ўчастковай камісіі разглядаюцца, калі яны ёсць, асобныя меркаванні членаў камісіі, а таксама скаргі і заявы аб парушэннях пры галасаванні або падліку галасоў.»;

часткі адзінаццатую і дванаццатую лічыць адпаведна часткамі дванаццатай і адзінаццатай.

25. Артыкул 61 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 61. Парадак вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь**

Вылучэнне кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь грамадзянамі ажыццяўляецца ініцыятыўнай групай выбаршчыкаў (далей — ініцыятыўная група) у колькасці не менш за 100 чалавек.

Спіс членаў ініцыятыўнай групы з называннем яе кіраўніка разам з заявай аб рэгістрацыі групы падаецца ў Цэнтральную камісію не пазней чым за 85 дзён да выбараў асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. У спісе называюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, пасада (занятак), месца працы і месца жыхарства, партыйнасць асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, а таксама прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства кожнага члена групы і яе кіраўніка. Пры падачы дакументаў у Цэнтральную камісію асоба, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, прад'яўляе пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Копіі старонак пашпарта, якія пацвярджаюць звесткі, неабходныя для рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, робяцца ў Цэнтральнай камісіі і сведчацца подпісам асобы, якая прыняла дакументы. Асоба, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, або кіраўнік ініцыятыўнай групы мае права ўносіць змяненні ў дакументы, пададзеныя для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, да разгляду Цэнтральнай камісіяй пытання аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, а таксама знаёміцца з матэрыяламі праверкі гэтых дакументаў.

Цэнтральная камісія ў пяцідзённы тэрмін разглядае заяву, рэгіструе ініцыятыўную групу і выдае членам ініцыятыўнай групы адпаведныя пасведчанні і падпісныя лісты для збору подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь (далей — падпісны ліст). У рэгістрацыі ініцыятыўнай групы адмаўляецца ў выпадку парушэння патрабаванняў гэтага Кодэкса. Адмова ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы можа быць абскарджана ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння аб адмове ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін.

У падпісным лісце пазначаюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, пасада (занятак), месца працы і месца жыхарства, партыйнасць асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, а таксама прозвішча, імя і імя па бацьку члена ініцыятыўнай групы, які збірае подпісы, і нумар рэгістрацыі ініцыятыўнай групы.

У падпісным лісце павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі толькі аднаго горада абласнога падпарадкавання, раёна, а ў гарадах з раённым падзелам — аднаго раёна.

Выбаршчык мае права падпісацца ў падтрымку асобы, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, толькі адзін раз.

У падпісным лісце ў дачыненні да выбаршчыка, які падтрымлівае асобу, якая прапануецца для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, пазначаецца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь або рэквізіты іншага дакумента, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй. Звесткі аб выбаршчыку ўносяцца ў падпісны ліст рукапісным спосабам. Выбаршчык уласнаручна ставіць у падпісным лісце дату падпісання і распісваецца. Подпісы нумаруюцца.

Удзел адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў, таксама як і прымушэнне ў працэсе збору подпісаў і ўзнагароджанне выбаршчыкаў за ўнясенне подпісу, не дапускаюцца. Парушэнне гэтых патрабаванняў можа быць падставай для адмовы ў рэгістрацыі або адмены рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Збор подпісаў выбаршчыкаў можа ажыццяўляцца ў форме пікетавання. Атрыманне дазволу на правядзенне пікетавання для названых мэтаў не патрабуецца, калі яно праводзіцца ў месцах, не забароненых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Падпісны ліст сведчыцца членам ініцыятыўнай групы, які збіраў подпісы. Член ініцыятыўнай групы пры сведчанні падпіснога ліста ставіць подпіс і дату яго ўнясення, а таксама пазначае прозвішча і ініцыялы.

Выбаршчыкі, якія вылучылі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, маюць права да здачы падпісных лістоў у раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зняць свае подпісы ў падпісных лістах, падаўшы аб гэтым заяву ў названыя камісіі.

Падпісныя лісты здаюцца не пазней чым за 50 дзён да выбараў у раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якая ў дзесяцідзённы тэрмін правярае сапраўднасць подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах, здадзеных членамі ініцыятыўнай групы, і забяспечвае дакладнасць звестак аб колькасці такіх подпісаў. Праверцы падлягае не менш за 20 працэнтаў подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах, здадзеных у адпаведную камісію.

Па выніках праверкі дакладнасці звестак у падпісных лістах подпіс выбаршчыка можа быць прызнаны сапраўдным або несапраўдным.

Праверцы і ўліку не падлягаюць подпісы выбаршчыкаў і адпаведныя ім звесткі, якія знаходзяцца ў падпісных лістах, але выключаныя (выкрасленыя) членам ініцыятыўнай групы, які збіраў подпісы, да падачы падпісных лістоў у адпаведную камісію, калі гэта выключэнне ім спецыяльна пісьмова агаворана. Праверцы і ўліку таксама не падлягаюць подпісы выбаршчыкаў і адпаведныя ім звесткі, калі ў падпісным лісце адсутнічаюць звесткі аб асобе, якая вылучаецца кандыдатам.

Калі ў падпісным лісце, які паступіў у раённую, гарадскую, раённую ў горадзе камісію, утрымліваюцца подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі розных раёнаў, гарадоў абласнога падпарадкавання, раёнаў у горадзе, праверцы і ўліку падлягаюць толькі подпісы, сабраныя на тэрыторыі таго раёна, горада, раёна ў горадзе, дзе ўтворана камісія, у якую здадзены гэты падпісны ліст. Астатнія подпісы не правяраюцца і не ўлічваюцца.

Несапраўднымі подпісамі лічацца:

фіктыўныя подпісы (выкананыя ад імя асобаў, якія не існуюць, і выдаюцца за сапраўдныя);

подпісы выбаршчыкаў, выкананыя ад імя розных асобаў адной асобай або ад імя адной асобы іншай асобай;

подпісы асобаў, якія не валодаюць выбарчым правам;

подпісы выбаршчыкаў, якія пазначылі ў падпісным лісце звесткі, што не адпавядаюць сапраўднасці;

подпісы выбаршчыкаў, сабраныя да ўстаноўленага тэрміну вылучэння кандыдатаў;

подпісы выбаршчыкаў, калі ў звестках аб іх адсутнічаюць адна ці некалькі звестак, якія патрабуюцца гэтым Кодэксам;

подпісы выбаршчыкаў, калі звесткі пра іх унесены ў падпісны ліст нерукапісным спосабам ці алоўкам, а таксама подпісы, даты ўнясення якіх выкананы выбаршчыкамі неўласнаручна;

усе подпісы выбаршчыкаў у падпісным лісце, калі подпісы сабраныя асобай, якая не з'яўляецца членам ініцыятыўнай групы, або калі падпісны ліст не засведчаны членам ініцыятыўнай групы або засведчаны іншым членам ініцыятыўнай групы, які не збіраў гэтыя подпісы;

подпісы выбаршчыкаў, сабраныя з парушэннем патрабаванняў часткі восьмай гэтага артыкула.

У выпадку выяўлення некалькіх подпісаў аднаго і таго ж выбаршчыка ў падтрымку вылучэння аднаго і таго ж кандыдата сапраўдным лічыцца толькі адзін подпіс, а астатнія подпісы лічацца несапраўднымі.

Калі колькасць выяўленых пры праверцы несапраўдных подпісаў складзе больш за 15 працэнтаў ад колькасці правераных подпісаў, праводзіцца дадатковая праверка яшчэ 15 працэнтаў подпісаў выбаршчыкаў ад колькасці подпісаў у падпісных лістах, здадзеных у адпаведную камісію членам (членамі) ініцыятыўнай групы.

У выпадку, калі сумарная колькасць несапраўдных подпісаў выбаршчыкаў, выяўленых пры праверках, складзе больш за 15 працэнтаў ад агульнай колькасці правераных подпісаў у падпісных лістах, далейшая праверка подпісаў у падпісных лістах раённай, гарадской, раённай у горадзе камісіяй спыняецца і ўсе подпісы выбаршчыкаў у здадзеных падпісных лістах не ўлічваюцца пры вызначэнні выніку збору подпісаў выбаршчыкаў у раёне, горадзе, раёне ў горадзе.

Праверыць сапраўднасць подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах пры неабходнасці ў пяцідзённы тэрмін могуць таксама абласныя і Мінская гарадская камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

На падставе пратаколаў раённых, гарадскіх, раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб вызначэнні колькасці выбаршчыкаў, якія паставілі ў падпісных лістах свае подпісы аб вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, і вынікаў праведзеных абласной, Мінскай гарадской камісіяй праверак сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах абласная, Мінская гарадская камісія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь падводзіць вынікі па вобласці, горадзе Мінску, складае аб гэтым пратакол і неадкладна накіроўвае яго ў Цэнтральную камісію.».

26. Часткі першую—трэцюю артыкула 62 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ад палітычных партый ажыццяўляецца вышэйшымі органамі палітычных партый.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты абласных, Мінскага гарадскога, раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў ад палітычных партый ажыццяўляецца адпаведна кіруючымі органамі абласных, Мінскай гарадской, раённых, гарадскіх арганізацыйных структур, створаных у вызначаным парадку да прызначэння выбараў.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання), пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў ад палітычных партый ажыццяўляецца адпаведна кіруючымі органамі раённых, гарадскіх арганізацыйных структур, створаных у вызначаным парадку да прызначэння выбараў. Кандыдатаў у дэпутаты гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання), пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў могуць вылучаць створаныя на тэрыторыі гэтых мясцовых Саветаў дэпутатаў у вызначаным парадку да прызначэння выбараў пярвічныя арганізацыі палітычных партый.».

27. У артыкуле 65:

частку першую дапоўніць чацвёртым сказам наступнага зместу: «Асоба, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты, або кіраўнік ініцыятыўнай групы мае права ўносіць змяненні ў дакументы, прадстаўленыя для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, да разгляду акружной, тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй пытання аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, а таксама знаёміцца з матэрыяламі праверкі гэтых дакументаў.»;

у частцы другой словы «ініцыятыўнай групай (скарга павінна быць падпісана большасцю яе складу)» замяніць словамі «асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у дэпутаты»;

пасля часткі трэцяй дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«У падпісных лістах павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі выбарчай акругі.»;

частку чацвёртую лічыць часткай пятай;

частку пятую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Збор подпісаў выбаршчыкаў для вылучэння кандыдата ў дэпутаты, сведчанне падпіснога ліста ажыццяўляюцца ў парадку, прадугледжаным часткамі чацвёртай, шостай—дзясятай артыкула 61 гэтага Кодэкса. Парушэнне патрабаванняў часткі восьмай артыкула 61 гэтага Кодэкса можа быць падставай для адмовы ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты або адмены рашэння аб яго рэгістрацыі.».

28. У артыкуле 66:

у частцы чацвёртай:

абзацы пяты і шосты выключыць;

абзац сёмы лічыць абзацам пятым;

у частцы восьмай:

абзацы шосты і сёмы выключыць;

абзац восьмы лічыць абзацам шостым;

у частцы дзявятай словы «трэцім—сёмым» замяніць словамі «трэцім—пятым»;

частку трынаццатую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Падпісныя лісты знаходзяцца ў акружных, тэрытарыяльных выбарчых камісіях, а пасля дня выбараў перадаюцца на захоўванне ў органы, якія ўтварылі камісіі.».

29. Частку другую артыкула 67 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Прызнанне сапраўднымі подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах праводзіцца ў парадку, прадугледжаным часткамі чатырнаццатай, шаснаццатай і сямнаццатай артыкула 61 гэтага Кодэкса. Калі ў падпісным лісце ўтрымліваюцца подпісы выбаршчыкаў, якія не пражываюць на тэрыторыі выбарчай акругі, гэтыя подпісы не правяраюцца і не ўлічваюцца.».

30. У артыкуле 68:

пасля часткі трэцяй дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«Асоба, вылучаная кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты, мае права знаёміцца з матэрыяламі праверкі дакументаў, прадстаўленых для рэгістрацыі.»;

частку чацвёртую—дваццатую лічыць адпаведна часткамі пятай—дваццаць першай;

частку пятую пасля слоў «аб даходах і маёмасці» дапоўніць словамі «асобы, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, яе жонкі (мужа) і паўналетніх блізкіх сваякоў, якія сумесна з ёй пражываюць і вядуць агульную гаспадарку,»;

частку сёмую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Пры прадстаўленні ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці асобы, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, або іншых асобаў, названых у частцы пятай гэтага артыкула, а таксама асобаў, вылучаных кандыдатамі ў дэпутаты, звестак, якія не адпавядаюць сапраўднасці і маюць істотны характар, адпаведна Цэнтральная камісія, акружная, тэрытарыяльная камісія мае права адмовіць у рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты або адмяніць рашэнне аб яго рэгістрацыі. Тлумачэнне аб тым, якія звесткі аб даходах і маёмасці, што не адпавядаюць сапраўднасці, маюць істотны характар, дае Цэнтральная камісія.»;

частку дваццаць першую дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «Пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Цэнтральная камісія таксама перадае ў сродкі масавай інфармацыі для апублікавання звестак аб даходах і маёмасці асобаў, названых у частцы пятай гэтага артыкула.».

31. У артыкуле 72:

пасля часткі другой дапоўніць артыкул часткамі наступнага зместу:

«Выраб бюлетэняў па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь забяспечвае Цэнтральная камісія, па выбарах дэпутатаў — акружныя, тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі. У выпадку неабходнасці акружныя, тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі могуць звярнуцца з просьбай аб вырабе бюлетэняў у вышэйстаячую тэрытарыяльную выбарчую камісію.

Пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў дапускаецца выраб бюлетэняў участковымі выбарчымі камісіямі, размешчанымі за межамі Рэспублікі Беларусь.

Колькасць бюлетэняў, якія вырабляюцца, не можа быць меншай за колькасць выбаршчыкаў, уключаных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў. Колькасць запасных бюлетэняў не павінна перавышаць 5 працэнтаў ад колькасці выбаршчыкаў. Канкрэтную колькасць бюлетэняў, якія вырабляюцца, вызначае адпаведная камісія.

Перадача бюлетэняў з вышэйстаячай выбарчай камісіі ў ніжэйстаячую выбарчую камісію, у тым ліку ва ўчастковую камісію, ажыццяўляецца згодна з актам. Участковыя выбарчыя камісіі забяспечваюцца бюлетэнямі не пазней за дзень, які папярэднічае дню датэрміновага галасавання, а ўчастковыя выбарчыя камісіі, у якіх не праводзіцца датэрміновае галасаванне, — не пазней за дзень, які папярэднічае дню выбараў. Адказнасць за захаванасць бюлетэняў нясуць старшыні камісій, якія ажыццяўляюць атрыманне, перадачу і захоўванне бюлетэняў.»;

часткі трэцюю—сёмую лічыць адпаведна часткамі сёмай—адзінаццатай;

частку адзінаццатую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Бюлетэні па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па выбарах дэпутатаў пасля падвядзення вынікаў галасавання разам з пратаколамі ўчастковых выбарчых камісій здаюцца ў адпаведныя тэрытарыяльныя, акружныя выбарчыя камісіі і захоўваюцца ў архівах адпаведных мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў на працягу шасці месяцаў пасля дня выбараў, а пасля знішчаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якое рэгулюе пытанні архіўнай справы і справаводства.».

32. У частцы шостай артыкула 76, назве, частках першай і другой артыкула 77 словы «вытворчых або службовых» замяніць словамі «працоўных (службовых)».

33. Абзац другі часткі першай і абзац чацвёрты часткі трэцяй артыкула 78 дапоўніць словамі «, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання».

34. У артыкуле 79:

абзац чацвёрты часткі першай дапоўніць словамі «, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання»;

частку пятую пасля першага сказа дапоўніць сказам наступнага зместу: «Заява аб паўторным падліку галасоў падаецца ў Цэнтральную камісію не пазней чым на трэці дзень пасля выбараў.»;

у частцы шостай слова «наступны» замяніць словам «трэці».

35. У частцы чацвёртай артыкула 81 і частцы чацвёртай артыкула 87 словы «часткай чацвёртай» і «шостай» замяніць адпаведна словамі «часткамі чацвёртай і шостай» і «сёмай».

36. У артыкуле 82:

абзац чацвёрты часткі першай дапоўніць словамі «, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання»;

у частцы чацвёртай:

слова «наступны» замяніць словам «трэці»;

дапоўніць частку трэцім сказам наступнага зместу: «Рашэнне акружной выбарчай камісіі можа быць абскарджана ў Цэнтральную камісію ў трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця.»;

у частцы пятай словы «тры дні» замяніць словамі «пяць дзён»;

частку сёмую пасля першага сказа дапоўніць сказам наступнага зместу: «Заява аб паўторным падліку галасоў падаецца ў Цэнтральную камісію не пазней чым на трэці дзень пасля выбараў.»;

першы сказ часткі восьмай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Паведамленне аб выніках выбараў па выбарчай акрузе акружная выбарчая камісія накіроўвае ў друк для апублікавання не пазней чым на пяты дзень пасля выбараў.».

37. Частку другую артыкула 84 дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб прызнанні выбараў несапраўднымі можа быць абскарджана кандыдатам у дэпутаты ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця.».

38. У артыкуле 89:

абзац чацвёрты часткі першай дапоўніць словамі «, у тым ліку колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць выбаршчыкаў, якія ўзялі ўдзел у галасаванні ў дзень выбараў у памяшканні ўчастка для галасавання»;

з часткі другой словы «, калі выбары былі прызнаныя адбыўшыміся» выключыць;

частку трэцюю выключыць;

часткі чацвёртую—дзявятую лічыць адпаведна часткамі трэцяй—восьмай;

у частцы трэцяй:

слова «наступны» замяніць словам «трэці»;

дапоўніць частку трэцім сказам наступнага зместу: «Рашэнне тэрытарыяльнай, акружной выбарчай камісіі можа быць абскарджана ў вышэйстаячую тэрытарыяльную выбарчую камісію ў трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця.»;

у частцы пятай словы «тры дні» замяніць словамі «пяць дзён»;

частку восьмую пасля першага сказа дапоўніць сказам наступнага зместу «Заява аб паўторным падліку галасоў падаецца ў вышэйстаячую выбарчую камісію не пазней чым на трэці дзень пасля выбараў.».

39. Частку другую артыкула 91 дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «Рашэнне тэрытарыяльнай выбарчай камісіі аб прызнанні выбараў несапраўднымі можа быць абскарджана кандыдатам у дэпутаты адпаведна ў раённы (гарадскі), абласны суд у трохдзённы тэрмін з дня яго прыняцця.».

40. З часткі другой артыкула 92 словы «якія не адбыліся,» выключыць.

41. Артыкул 93 выключыць.

42. У артыкуле 94:

з часткі першай словы «якія не адбыліся або» выключыць;

у частцы трэцяй слова «шосты» замяніць словам «сёмы».

43. Частку другую артыкула 107 дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «Рашэнне Цэнтральнай камісіі аб прызнанні выбараў несапраўднымі можа быць абскарджана кандыдатам у члены Савета Рэспублікі ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння.».

44. У артыкуле 114:

у частцы другой слова «старшыні» замяніць словам «кіраўніка»;

у частцы чацвёртай:

першы сказ выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«У спісе ініцыятыўнай групы ў дачыненні да кожнага члена групы пазначаюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.»;

у другім сказе слова «старшыня» замяніць словам «кіраўнік»;

у частцы шостай слова «Пракуратуру» замяніць словамі «Генеральную пракуратуру»;

у частцы сёмай словы «Пракуратуры» і «(скарга павінна быць падпісана большасцю складу ініцыятыўнай групы)» замяніць адпаведна словамі «Генеральнай пракуратуры» і «кіраўніком ініцыятыўнай групы»;

частку дзясятую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«На падрыхтоўку і правядзенне рэферэндуму забараняецца выкарыстоўваць сродкі замежных дзяржаў і арганізацый, міжнародных арганізацый, арганізацый з замежнымі інвестыцыямі, замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства.».

45. У артыкуле 115:

частку трэцюю выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«У падпісным лісце павінны быць подпісы грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі толькі аднаго горада абласнога падпарадкавання, раёна, а ў гарадах з раённым падзелам — аднаго раёна.»;

першы сказ часткі чацвёртай выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«У падпісным лісце ў дачыненні да грамадзяніна, які падтрымлівае прапанову аб правядзенні рэферэндуму, пазначаюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь або рэквізіты іншага дакумента, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй.»;

частку шостую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Падпісны ліст сведчыцца членам ініцыятыўнай групы, які збіраў подпісы. Член ініцыятыўнай групы пры сведчанні падпіснога ліста ставіць подпіс і дату яе ўнясення, а таксама пазначае прозвішча і ініцыялы.»;

частку восьмую выключыць.

46. У артыкуле 116:

у частцы другой:

словы «трынаццатай і чатырнаццатай» замяніць словамі «чатырнаццатай і шаснаццатай»;

дапоўніць частку трэцім—пятым сказамі наступнага зместу: «Праверцы і ўліку не падлягаюць подпісы грамадзян, калі ў падпісным лісце адсутнічае фармулёўка пытання, якое прапануецца на рэферэндум, і (або) выкладанне сутнасці рашэння (законапраекта), якое прапануецца. Калі ў падпісным лісце, які паступіў у раённы, гарадскі выканаўчы камітэт, мясцовую адміністрацыю ў горадзе, утрымліваюцца подпісы грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі розных раёнаў, гарадоў абласнога падпарадкавання, раёнаў у горадзе, праверцы і ўліку падлягаюць толькі подпісы, сабраныя на тэрыторыі таго раёна, горада, раёна ў горадзе, у выканаўчы камітэт якога, мясцовую адміністрацыю ў горадзе здадзены гэты падпісны ліст. Астатнія подпісы не правяраюцца і не ўлічваюцца.»;

у частцы трынаццатай словы «(скарга павінна быць падпісана большасцю складу ініцыятыўнай групы)» замяніць словамі «кіраўніком ініцыятыўнай групы».

47. У артыкуле 118:

пасля часткі чацвёртай дапоўніць артыкул часткамі наступнага зместу:

«Выраб бюлетэняў для галасавання па рэспубліканскім рэферэндуме забяспечвае Цэнтральная камісія.

Пры правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму дапускаецца выраб бюлетэняў участковымі камісіямі, размешчанымі за межамі Рэспублікі Беларусь.

Колькасць бюлетэняў, што вырабляюцца, не можа быць меншай за колькасць удзельнікаў рэферэндуму, уключаных у спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у рэферэндуме. Колькасць запасных бюлетэняў не павінна перавышаць 5 працэнтаў ад колькасці ўдзельнікаў рэферэндуму. Канкрэтную колькасць бюлетэняў, якія вырабляюцца, вызначае Цэнтральная камісія.

Перадача бюлетэняў у ніжэйстаячыя камісіі па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму, у тым ліку ва ўчастковыя камісіі, ажыццяўляецца згодна з актам. Участковыя камісіі забяспечваюцца бюлетэнямі не пазней за дзень, які папярэднічае дню датэрміновага галасавання, а ўчастковыя камісіі, у якіх не праводзіцца датэрміновае галасаванне, — не пазней за дзень, які папярэднічае дню рэферэндуму. Адказнасць за захаванасць бюлетэняў нясуць старшыні камісій, якія ажыццяўляюць атрыманне, перадачу і захоўванне бюлетэняў.»;

часткі пятую—восьмую лічыць адпаведна часткамі дзявятай—дванаццатай;

частку дванаццатую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Бюлетэні для галасавання па рэспубліканскім рэферэндуме пасля падвядзення вынікаў галасавання разам з пратаколамі ўчастковых камісій здаюцца ў раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах камісіі і захоўваюцца ў архівах адпаведных мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў на працягу шасці месяцаў пасля дня рэферэндуму, а пасля знішчаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якое рэгулюе пытанні архіўнай справы і справаводства.».

48. Абзац чацвёрты часткі першай артыкула 119, абзац чацвёрты часткі першай артыкула 120 і абзац чацвёрты часткі першай артыкула 121 дапоўніць словамі «, у тым ліку колькасць грамадзян, якія ўзялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, колькасць грамадзян, якія ўзялі ўдзел у галасаванні па месцы знаходжання, і колькасць грамадзян, якія ўзялі ўдзел у галасаванні ў дзень рэферэндуму ў памяшканні ўчастка для галасавання».

49. У артыкуле 132:

частку дзявятую пасля другога сказа дапоўніць сказам наступнага зместу: «На сходзе выбіраецца кіраўнік ініцыятыўнай групы.»;

частку дванаццатую дапоўніць словамі «і кіраўніка ініцыятыўнай групы».

50. У артыкуле 134:

частку другую пасля слоў «спіс складу ініцыятыўнай групы» дапоўніць словамі «з указаннем яе кіраўніка»;

у частцы чацвёртай словы «ініцыятыўнай групай (скарга павінна быць падпісана большасцю яе складу)» замяніць словамі «кіраўніком ініцыятыўнай групы».

51. У артыкуле 136:

другі сказ часткі першай выкласці ў наступнай рэдакцыі: «У падпісным лісце павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі выбарчай акругі, па якой узбуджана пытанне аб адкліканні дэпутата.»;

першы сказ часткі другой выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«У падпісным лісце ў дачыненні да выбаршчыка, які падтрымлівае прапанову аб узбуджэнні пытання аб адкліканні дэпутата, пазначаюцца прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца жыхарства, серыя і нумар пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь або рэквізіты іншага дакумента, які вызначаецца Цэнтральнай камісіяй.»;

частку трэцюю выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Падпісны ліст сведчыцца членам ініцыятыўнай групы, які сабраў подпісы. Член ініцыятыўнай групы пры сведчанні падпіснога ліста ставіць подпіс і дату яго ўнясенні, а таксама пазначае прозвішча і ініцыялы.».

52. У артыкуле 137:

у абзацы трэцім часткі першай словы «раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання)» замяніць словам «абласнога»;

частку трэцюю выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Прызнанне сапраўднымі подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку прапановы аб узбуджэнні пытання аб адкліканні дэпутата праводзіцца ў парадку, прадугледжаным часткамі чатырнаццатай і шаснаццатай артыкула 61 гэтага Кодэкса. Несапраўднымі лічацца таксама подпісы выбаршчыкаў, сабраныя да рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. Калі ў падпісным лісце ўтрымліваюцца подпісы выбаршчыкаў, якія не пражываюць на тэрыторыі выбарчай акругі, гэтыя подпісы не правяраюцца і не ўлічваюцца. Праверцы і ўліку таксама не падлягаюць подпісы выбаршчыкаў, калі ў падпісным лісце адсутнічае фармулёўка прапановы аб адкліканні дэпутата і (або) звесткі пра дэпутата, у дачыненні да якога ўзбуджана пытанне аб адкліканні.»;

частку сёмую выключыць;

частку восьмую лічыць часткай сёмай.

53. У частцы пятай артыкула 138 словы «ініцыятыўнай групай (скарга павінна быць падпісана большасцю яе складу)» замяніць словамі «кіраўніком ініцыятыўнай групы».

54. у артыкуле 141:

частку восьмую дапоўніць другім і трэцім сказамі наступнага зместу: «Скарга аб прызнанні вынікаў галасавання аб адкліканні дэпутата несапраўднымі падаецца адпаведна ў Цэнтральную камісію, акружную, тэрытарыяльную камісію не пазней чым на трэці дзень пасля галасавання. Рашэнне Цэнтральнай камісіі, тэрытарыяльнай, акружной камісіі аб прызнанні вынікаў галасавання несапраўднымі ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння можа быць абскарджана адпаведна ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, абласны, Мінскі гарадскі, раённы, гарадскі суд.»;

частку дзявятую пасля першага сказа дапоўніць сказам наступнага зместу: «Заява аб паўторным падліку галасоў падаецца адпаведна ў Цэнтральную камісію, вышэйстаячую тэрытарыяльную камісію не пазней чым на трэці дзень пасля галасавання аб адкліканні дэпутата.»;

частку дзясятую выключыць;

часткі адзінаццатую і дванаццатую лічыць адпаведна часткамі дзясятай і адзінаццатай;

у частцы дзясятай словы «ініцыятыўнай групай (скарга павінна быць падпісана большасцю яе складу)» замяніць словамі «кіраўніком ініцыятыўнай групы».

55. У частцы другой артыкула 149 словы «дзяржаўнага бюджэту» замяніць словамі «рэспубліканскага або мясцовага бюджэтаў».

56. У артыкуле 155:

у абзацы трынаццатым словы «член палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання, працоўнага калектыву, прадстаўнік грамадзян» замяніць словамі «прадстаўнік палітычнай партыі, іншага грамадскага аб'яднання, працоўнага калектыву, грамадзян»;

дапоўніць артыкул абзацамі шаснаццатым—васямнаццатым наступнага зместу:

«дэбаты — выказванні двух і больш кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па шырокім коле грамадска значных праблемаў, у тым ліку паведамленні, якія датычацца перадвыбарных праграм іншых кандыдатаў, зробленыя ў ходзе публічнага абмену меркаваннямі, пытаннямі;

добраахвотнае ахвяраванне грамадзяніна — бязвыплатнае ўнясенне грамадзянінам Рэспублікі Беларусь уласных грашовых сродкаў на спецыяльны выбарчы рахунак кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў або ў пазабюджэтны фонд, які ствараецца Цэнтральнай камісіяй;

добраахвотнае ахвяраванне юрыдычнай асобы — бязвыплатнае пералічэнне юрыдычнай асобай грашовых сродкаў з свайго разліковага рахунку на спецыяльны выбарчы рахунак кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў або ў пазабюджэтны фонд, які ствараецца Цэнтральнай камісіяй.».

**Артыкул 3.** Прызнаць страціўшым сілу Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 красавіка 1998 года «Аб Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 20, ст. 218).

**Артыкул 4.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласным, Мінскаму гарадскому выканаўчым камітэтам у трохмесячны тэрмін прыняць меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 5.** Гэты Закон уваходзіць у сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**

*4 студзеня 2010 года, г. Мінск.*
*№ 99—З*

# Ці ёсць шчасце на балоце?

**НА гэтым тыдні Ганцавіцкі раён адзначае свой 70-гадовы юбілей. Вось і выпала нагода яшчэ раз наведаць Ганцавічы — гэты самабытны палескі край. Пра тутэйшых людзей даводзілася пісаць шмат, напярэдадні Калядаў вырашыў сустрэцца са старшынёй райвыканкама Уладзімірам СТОЛЯРАМ.**



У прыёмнай сказалі, што ў кабінеце кіраўніка раёна дзеці — прыйшлі павіншаваць з надыходным святам.

Гэтая традыцыя тут існуе не першы год. 6 студзеня выхаванцы дзіцячага садка № 7 абменьваюцца з Уладзімірам Міхайлавічам віншаваннямі і падарункамі.

Дастаў фотаапарат і адчыніў дзверы кабінета. Малыя дэкламавалі вершы на «вялікім і магутным», але на развітанне дружна сказалі: «Да пабачэння» — пераняпі ад гаспадара кабінета.

А ў нас размова пайшла пра юбілей, які будуць адзначаць і іншыя раёны Брэстчыны. Усё ж 70 гадоў — гэта чалавечы век ці свядомае жыццё некалькіх пакаленняў, і тут без падвядзення вынікаў не абысціся. Што прынеслі яны палешукам?

— *Савецкая ўлада разбурыла спрадвечны ўклад жыцця палешукоў, але з ізаляцыі іх вырвала меліярацыя, якая пачалася ў 1966 годзе. Паляшук — гэта чалавек, які шукае поле, а з асушэннем балот поле з'явілася. У нашым раёне 76 % меліяраванай зямлі. Не меней важна і тое, што Палессе пакрылі аўтамагістралямі — перад палешукамі адкрыўся свет. Раней да некаторых буйных вёсак у нашым раёне было праблематычна дабрацца.*

— Уладзімір Міхайлавіч, атрымліваецца, што вашы людзі шмат за што павінны быць удзячныя Савецкай уладзе, але палешукі сутыкнуліся з тарфянымі бурамі, якіх раней не ведалі, замаразкамі...

— *Пачалася перабудова, і меліярацыйныя сістэмы пачалі прыходзіць у заняпад, прырода пачала вяртаць страчанае. Адсюль і прыродныя катаклізмы. Ніхто не адмаўляе, што пры меліярацыі не ўсё было прадумана і яна мела агрэхі.*

— Давайце вернемся ў суверэнную Беларусь — перыяд, у які на пасадзе кіраўніка раёна вы адпрацавалі ўжо 9 гадоў. Да вас шэраг кіраўнікоў, паспрабаваўшы хлеба ў Ганцавіцкім раёне, праз год—два імкнуліся хутчэй пакінуць гэты кабінет. А што вас утрымлівае ў раёне, у якім разлічваць на пахвалы і ўзнагароды не даводзіцца, а, хутчэй, наадварот?

— *А гэта мая праца. Вось мне выпаў такі раён і я за яго адказваю. А яшчэ гэты рэгіён Палесся называюць Ганцавіцкай зонай. У яе ўключаюць тэрыторыі раёнаў, якія мяжуюцца з Ганцавіцкім краем: Ляхавіцкага, Івацэвіцкага, Пінскага, Лунінецкага і нават Клецкага, бо сітуацыя ў гэтай зоне аднолькавая. У нашым раёне жывуць людзі і пакідаць родныя мясціны не збіраюцца. А ў такім выпадку ўся інфраструктура павінна працаваць. З часам прыкіпеў да гэтага краю, з'явілася ўлюбёнасць у мясцовага чалавека... Людзі да цябе ідуць паскардзіцца, папрасіць дапамогі. Маці адпісала дачцэ хату і цяпер старой няма дзе жыць. Муж пабіў жонку і жанчына прыходзіць да мяне... маўляў, дапамажыце, а тое, што ёсць законы і іх не абыдзеш, часам да галавы не бяруць. Ты ж у раёне галоўны...*

— Давайце сканцэнтруем увагу на апошніх дзевяці гадах жыцця раёна...

— *Сёння сярэдні заробак у прамысловасці па раёне — 300 долараў, а ў сельскай гаспадарцы — 200, а дзевяць гадоў таму быў адпаведна 31 і 19 долараў. Быў перыяд, калі ў Ганцавічах не хапала вады, нават халодную падавалі па графіку. Праклалі новую нітку водаправоду, і праблему вырашылі. Пабудавалі модульную кацельню. У раён прыйшоў газ і сёння актыўна ідзе газіфікацыя прыватнага сектара. Перад Новым годам здалі 100 кватэр, а наконт парадку, то ён у нас ёсць. Гэта нават адзначылі на абласным узроўні. З 2005 года эканоміка раёна пачала даваць прыбытак, а да гэтага 20 гадоў была стратнай.*

— Можна сказаць, што ёсць шчасце і ў людзей на балоце?

— *Шчасце — паняцце даволі суб'ектыўнае. У людзей растуць запатрабаванні, а разам з імі — і бытавое шчасце. Некалі, калі хтосьці меў «Масквіч», то гэта ўжо ўспрымалася як дасягненне ў жыцці. А сёння, калі ў сям'і ёсць і дзве аўтамашыны, нікога не здзівіш — звычайная з'ява. Пральныя машыны, камп'ютары, як і іншая тэхніка, чалавека можа парадаваць, але наўрад ці ашчаслівіць. Людзі хочуць жыць лепш і лепш. Хоць некага можа радаваць і тое, што ў сям'і лад, дзеці ўладкаваныя ў жыцці, ёсць здароўе.*

— А ваша шчасце?

— *Быццам бы вось яно, расслабіўся, а тут тэлефануюць, што трубы лопнулі, а на вуліцы зіма, у нейкім сельгаскааператыве надоі знізіліся... і шчасце цьмянее. Грамадскае пераплятаецца з асабістым.*

— Уладзімір Міхайлавіч, афіцыйная статыстыка сцвярджае, што ў Ганцавіцкім раёне самае высокае беспрацоўе па краіне — 2,1 %.

— *На 1 студзеня 2010 года ў нас зарэгістравана 228 беспрацоўных, а калі я прыйшоў у раён, то беспрацоўнымі былі амаль 1500 чалавек. На сёння мы маем 100 свабодных працоўных месцаў, але ж чалавек выбірае. Аднаго не задавальняе зарплата, а іншаму спецыяльнасць не падыходзіць... З раёна прыкладна 300—400 чалавек выязджаюць на заробкі, але апошнім часам усё больш вяртаюцца дамоў, і цяпер у будаўнічых арганізацыях ёсць з каго выбіраць спецыялістаў, а раней набіралі ўсіх без разбору. У раёне няма буйных прадпрыемстваў, але стабільна працуе «Модуль», які вырабляе трубы для жыллёва-камунальнай гаспадаркі па найноўшай тэхналогіі.*

*Баранавіцкая мэблевая фабрыка «Лагуна» адчыняе ў нас свой філіял, працуе літоўскае прадпрыемства «Ветрыя», якое займаецца глыбокім замарожваннем ягад. Вось і эстонцы адчынілі фірму па апрацоўцы драўніны. Але хацелася б большага.*

— На Століншчыне людзі не чакаюць, што ім дадуць працу, а самі робяць захады каб выжыць. Цяпліцы там уражваюць памерамі і народ на гурках робіць грошы. А ў вашым раёне такой дзелавой хваткі няма. Палешукі, ды не тыя?

— *Нашы прывыклі да гатовага. Дзве трэці раёна пад лесам, а гэта ягады, грыбы, дрэваапрацоўка.... На Століншчыне такога раздолля няма. Там за сотку зямлі чалавеку трэба пазмагацца. Нават у Лунінецкім раёне, каб вырасціць клубніцы, неабходна папрацаваць. Нашы палешукі да новага ставяцца насцярожана, але паглядзіце, якія ў вёсках дамы — вялікія, з «венскімі» вокнамі. Не ва ўсіх рэгіёнах краіны такія ўбачыш. Менталітэт народа вызначае ўклад жыцця. Вось і характар мясцовага люду гартаваўся сярод лесу і балот — можна толькі зайздросціць іх жыццёвай сіле. Народ песенны, з багатай народнай культурай. Няхай і надалей такім застаецца.*

— Юбілей як думаеце адзначыць?

— *Напачатку адсвяткуем Каляды, сустрэнем стары Новы год, а ў пятніцу ў гарадскім Доме культуры правядзём урачыстае мерапрыемства — усё будзе!.*

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

*Ганцавіцкі раён.*

# Гэтая ноч — сапраўдная зімовая кветка. Асабліва на Палессі





Пракаветнае



Яе называюць па-рознаму: «Шчодрыкі», «Шчадрэц», «Шчадроўка», «Шчодры вечар». У Давыд-Гарадку на Гарыні кажуць: «Конікі», а ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна — «Цары». Шчодрая куцця, пачатак Шчодрага тыдня сталі падставаю назвы і каляднага вечара, які дагэтуль моцна шануюць і адзначаюць праваслаўныя беларусы. «Святы вечар, Шчодры вечар, Добры вечар...» — спяваюць калядоўшчыкі пад вокнамі і ў саміх хатах у ноч з 13 на 14 студзеня. З усіх калядных дзён і вечароў гэты — самы гучны, вясёлы, каляровы і маскарадны. Шчадроўшчыкі «водзяць» за сабою казу, мядзведзя, каня, бусла, сароку, якія сімвалізуюць самыя розныя стыхіі і з'явы прыроды, і іхняе з'яўленне азначае перамогу добрага над злым, сонца над цемраю. Дзе-нідзе носяць звязду, спяваюць і танчаць пад гармонік, апранаюцца ў касцюмы персанажаў вядомых мультфільмаў. Але ўсё сведчыць пра сапраўдную радасць надыходу новага года і дае надзею, што ён будзе шчодрым (багатым) і шчаслівым. Асабліва шануюць ноч на стары Новы год на Палессі. Ці не ў кожнай вёсцы, дзе ёсць моладзь (ці ўжо няма), па даўняй традыцыі адбываюцца калядаванні. Шмат залежыць цяпер ад клубных работнікаў, але ўласную ініцыятыву нічым не падменіш. Захавалася шмат унікальных гуртоў, якія варта браць пад ахову дзяржавы. Сапраўдны феномен — калядныя «Конікі» ў Давыд-Гарадку, да якіх работнікі культуры не маюць ніякага дачынення. На фотаздымку толькі невялікая частка тых, хто сёння ўночы адправіцца шчадраваць на замеценыя пагарынскія вулкі. Заўсёды чакаюць каляднікаў у вёсцы Хатынічы Ганцавіцкага раёна, выглядваючы з кожнага акна. А свята прыходзіць туды, дзе яго чакаюць. А адзін з найлепшых гуртоў на Піншчыне — у вёсцы Камень, які здзіўляе характэрнымі маскамі і касцюмамі любімых народных персанажаў, і, асабліва, самабытнымі галасамі і песнямі.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

# ПАКУПНІК... ЗАТРЫМАЎ ПАКУПНІКОЎ

**У віцебскім папулярным гандлёвым цэнтры «Эвіком» выпадковы наведвальнік затрымаў двух зладзеяў. Адзін з іх скраў мужчынскую куртку і не без удзелу таварыша. Мо і ўсё б атрымалася, калі б не ўмяшаўся неабыякавы чалавек. Як потым высветлілася — міліцыянер.**

У выхадны дзень прапаршчык Ігар Лапавухаў, намеснік камандзіра ўзвода палка патрульна-паставой службы міліцыі прыйшоў у гандлёвы цэнтр, каб зрабіць пакупкі. Калі разглядваў тавары на вітрыне, выпадкова звярнуў увагу на двух хлопцаў. Адзін звярнуўся да прадаўца з просьбай прымераць рэч. Пасля чаго зняў сваю куртку, перадаў яе сябру і апрануў на сябе куртку з манекена. Падчас гэтага таварыш з курткай у руках пачаў адыходзіць ад павільёна. А зламыснік, убачыўшы, што гандляр на хвілінку заняўся іншымі справамі, не здымаючы курткі, таксама пайшоў...

Міліцыянер у цывільным адразу ж накіраваўся за хлопцамі. І ўжо ў раёне выхада з гандлёвага цэнтра затрымаў іх. Паказаў службовае пасведчанне, выклікаў міліцэйскую падмогу па мабільным тэлефоне. У дачыненні да 24-гадовага жыхара Віцебска — аматара куртак «на халяву», завялі крымінальную справу. А міліцыянера вырашылі заахвоціць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Крадуць

# ...АД ЗОЛАТА ДА КУРЭЙ

У 40-гадовай жыхаркі Брэста, якая пражывае па зав. Кобрынскім, затрымаўся на ноч 23-гадовы беспрацоўны. Калі начлежнік пакінуў дом, жанчына выявіла, што прапала ўсё золата — 8 ювелірных вырабаў. Давялося звярнуцца ў міліцыю. Злодзея шукаюць.

Са склада сельгаспрадпрыемства вёскі Шані Пружанскага раёна зламыснікі скралі 10 мяхоў сухога малака на суму 1 мільён 300 тысяч рублёў. Зладзеі — маладыя непрацуючыя мужчыны — былі затрыманы міліцыяй, узбуджана крымінальная справа.

У Альшанах Столінскага раёна завяліся зладзеі, якія спецыялізуюцца на крадзяжы стартараў з трактароў у асабістых гаспадарках. Так, за мінулы тыдзень у двух гаспадароў з трактароў МТЗ-82 сцягнулі патрэбныя дэталі. Пад падазрэнне трапілі непрацуючыя аднавяскоўцы пацярпелых.

У в. Жыдча (Пінскі раён) абакралі даярку мясцовага сельгаскааператыва. Калі жанчына раніцой зазірнула ў куратнік, то ўбачыла, што там пуста — знікла дзесяць курэй. Аператыўнікі злодзея знайшлі ў в. Хойна. Чубатак выкраў 19-гадовы жыхар гэтай вёскі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ, Яна СВЕТАВА.**

Напярэдадні

# ДЗЕ КАЗА СКАЧА, ТАМ НІХТО НЕ ПЛАЧА

Раскажу, як у пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя мы вадзілі «казу» ў вёсцы майго дзяцінства, што на Глушчыне Магілёўскай вобласці.

Рыхтаваліся, значыць, загадзя. Па хатах шукалі новы аўчынны кажух, апраналі на спецыяльна зробленую дугу, упрыгожвалі пафарбаванай у розныя колеры асінавай стружкай, падбіралі каманду з пяці-шасці карослых, але дужых хлопцаў, бо скакаць унутры кажуха, трымаючы адной рукой дугу, а другой звонячы ў невялікі званочак — справа не для слабых.

Усяго ў гурце калядніжаў была дзесяці чалавек, і кожны меў свае абавязкі. Першым у хату заходзіў «віншавальнік» — жадаў дабрабыту, прасіў дазволу «казачцы паскакаць». Калі ён, гэты дазвол, даваўся, запускалі «жывёл», а світа, хлопцы-каляднікі, спявалі:

*«Мы не самі ішлі, нас Гасподзь паслаў*
*З Ісусам Хрыстом, святым Ражаством!*
*Прачыстая Маць вялела гуляць*
*Па ўсяму двару, па гаспадару.*
*А ў тым двары жылі слаўных тры стральцы,*
*Яны мелiся казу ўбіці, скуру злупіці, кажуха пашыці.*
*Наша казочка спужалася, як легла спаці, не магла ўстаці.*
*Просіць што даці: паўпуда аўса, наверх каўбаса.*
*Два кускі сала, каб казочка ўстала».*

Калі песня заканчвалася, яна, тая казочка, станавілася на каленцы, гаспадар, каб ужо зусім падняць, адорваў яе ўсім патрохам: грашыма, хлебам, салам. Была прыкмета: калі ў хаце каза скача, дык усё тут добра, калі казу не пускалі, у хаце нешта здарылася...

Цяпер на вуліцы гарадоў і вёсак зноў вярнуліся калядоўнікі. Гэта добры знак адраджэння нашых звычаяў і традыцый. Дык будзем жа ладзіць Каляды, свята, маскарад, у час якога кожны забудзецца на штодзённыя клопаты і абавязкі, адчуе сябе дзіцем, якому хочацца верыць у казкі і ў тое, што наперадзе — радасць і шчасце.

**Валерый ВАСІЛЕЎСКІ.**

*г.п. Глуск, Магілёўская вобласць.*

# ПЯЦЬ ДЗЯЎЧАТАК, і ўсе — прыгажуні

**ДЛЯ маці, якія нарадзілі немаўлятак у першы дзень года ў Гомелі, гэта — непарушная ісціна.**



Старшыня гомельскага абласнога аб'яднання «Белая русь» Ала НАВУМЧЫК, начальнік аддзела па справах моладзі Гомельскага гарвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ і Роза ШАГАЯН.

***— Кажуць, калі ў большасці дзяўчаткі на свет з'яўляюцца — вайны не будзе, а тут — ніводнага хлапчука, — усміхаюцца ўрачы.***

Між іншым, акцыя, якая прайшла па ініцыятыве аддзела па справах моладзі Гомельскага гарвыканкама ва ўсіх радзільнях абласнога цэнтра, закліканая не толькі павіншаваць бацькоў, якія пачалі год прыбаўленнем у сямействе, але і даць прыклад іншым. Тым, якія пакуль думаюць: нараджаць ці пачакаць.

29-гадовая Роза Шагаян — адна з тых, хто пастуопова прывыкае да статусу матулі. Яны з мужам два гады як прыехалі на беларускую зямлю і вельмі рады, што іх дзіцятка нарадзілася менавіта тут першага студзеня новага года:

***— Гэта тая краіна, дзе прыемна жыць. Маёй маленькай Жанне будзе тут добра. Усё тут падабаецца.***

— Наша задача — звярнуць увагу грамадскасці да праблем дэмаграфіі, — падкрэслівае начальнік аддзела па справах моладзі Гомельскага гарвыканкама Уладзімір Прывалаў і жадае Розе з дачкой хутчэй набыць статус грамадзян краіны.

Такая адметнасць: сярод пяці дзяцей, што нарадзіліся за першы дзень 2010 года — бацькі дваіх маюць пакуль толькі пасведчанне на права жыхарства ў Беларусі. Добра гэта ці дрэнна? Калі сям'я сумленна прымае законы і культуру той краіны, у якой жыве, чаму не, — лічыць старшыня гомельскага абласнога аб'яднання «Белая Русь», член Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, рэктар Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі Ала Навумчык:

***— Гэта ж цуд — нараджэнне дзіцяці. Нам вельмі прыемна падзяліць гэтую радасць разам з матулямі.***

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**

Шчыра і сардэчна віншуем **Зінаіду Канстанцінаўну ДЗЕВЯЛТОЎСКУЮ** з в. Дзягілі Мядзельскага раёна **з 85-годдзем з дня нараджэння**. Ад усёй душы жадаем дарагой матулі і бабулі моцнага фізічнага і духоўнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця і простага зямнога шчасця.

**Сем'і дзяцей, унукаў і праўнукі.**

# «УЗОРНАМУ ХОРУ І ЯГО ДЫРЫЖОРУ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пакуль ішла дадому, абдумвала свой сцэнарый гутаркі, а як у хату ўвайшла — усю рэжысуру пакінула за парогам. Сказала як ёсць, адразу. Вось толькі слёзы не паслухаліся, не змагла іх стрымаць. Але ў вачах яго ўбачыла падтрымку... Потым ужо былі словы. Мусіць, ад таго моманту і пачала сябе рыхтаваць, настройвацца на ролю мамы трайнят. Ад уласнага настрою, ад умення сябе падрыхтаваць, вой, як многа залежыць. Гэта аўтар радкоў зразумела, калі ўбачыла Вольгу. Замест стомленай і змарнелай за год цяжкай працы жанчыны мяне сустрэла жыццярадасная, прыгожая, упэўненая ў сабе маці сямейства, якая нібы матылёк, шпарка і лёгка перамяшчаецца па доме і ўпраўляецца з дзецьмі ды хатняй гаспадаркай. А ў яе ж за гэты год яшчэ ніводнай ночы не было спакойнай, і калі яна, тая ноч, будзе, пакуль сказаць цяжка. Але ў яе ёсць утульны дом, любімы муж і дзеці — усё, што трэба для шчасця. Шчаслівая жанчына здольная пераадолець многія цяжкасці. Прынамсі, гэта маё ўласнае ўражанне. Але не думаю, што Вольга стала б яго аспрэчваць.

## Сімвалізм і вытворчасць

Цяпер яна шмат у чым бачыць нейкі сімвалізм. Ну, напрыклад, у тым, як прыйшла на працу адразу пасля ўніверсітэта: прыйшла на замену падчас дэкрэтнага водпуска супрацоўніцы. Вольга скончыла геаграфічны факультэт Брэсцкага ўніверсітэта. Працаваць яе ўзялі на часовую пасаду ў камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Але названая супрацоўніца выйшла на працу раней, чым праз тры гады, і Вольга перайшла ў іншую арганізацыю, таксама звязаную з аховай прыроды. Ды працавала там нядоўга: каляжанка другі раз пайшла ў дэкрэтны, зноў вызваліўшы Вользе месца. А нядаўна — вось супадзенне — тая самая работніца пайшла ў дэкрэтны трэці раз. І гэта ў калектыве, дзе нават разам з раённымі інспекцыямі на пальцах можна пералічыць колькасць сем'яў, якія маюць па трое дзяцей. Хто скажа, што пачын Вольгі Міхальчук не стаў добрым прыкладам для іншых?

Дарэчы, у сваім калектыве яе таксама падтрымалі, наколькі гэта магчыма ў такой сітуацыі. Можна пачаць з таго, што некалькі чалавек ведалі, якое папаўненне чакае калега, але не рассакрэцілі яе. Праўду кажуць: як хочаш нешта схаваць, пакладзі на самае віднае месца. Вольга не без смеху ўспамінае пытанні калег перад самым яе дэкрэтным накшталт таго: «Нешта ты, Волечка, надта акруглела, ці не двое там?» «Трое», — адказвала яна, і той, хто пытаўся, смяяўся, як удаламу жарту. Ну, а калі дзеці з'явіліся, усе, як маглі перадавалі свае віншаванні і словы падтрымкі. А наколькі гэта падтрымка важная, не ведае той, хто ніколі не быў у дэкрэтным. Даць адчуць чалавеку, што на яго не забыліся на працы, што лічаць сваім, — для гэтага не трэба капіталаўкладанняў, трэба толькі крыху чалавечнасці і душэўнага такту. Нават адно слова, сказанае да месца і часу, можа стаць своеасаблівай маральнай падтрымкай. Так, аднойчы адзін кіраўнік сказаў гераічнай маме, калі пачуў у тэлефоннай трубцы дружны плач: «Вітанне ўзорнаму хору і яго дырыжору!», а потым павіншаваў з надыходным святам. Я расказала пра гэта Вользе, і яна не без гонару за свой калектыў распавяла пра адну маленькую дэталь традыцыйнага навагодняга віншавання свайго кіраўніка на агульным сходзе. Дык вось, старшыня абласнога камітэта аховы навакольнага асяроддзя Тамара Ялкоўская ў ліку набыткаў арганізацыі за мінулы год назвала нараджэнне трайні адным з супрацоўнікаў. Вядома, Вольгу пра гэта адразу праінфармавалі калегі, і ёй было вельмі прыемна.

«Ці хочацца на працу?» — цікаўлюся ў суразмоўніцы. «Не, пакуль не», — чую ў адказ. Па сваіх службовых абавязках Вольга Васільеўна займалася праблемамі абыходжання з адходамі. А праблемы, як вядома, болей чым актуальныя для нашай дзяржавы. У яе ёсць сваё меркаванне наконт таго, як пазбавіцца ад пэт-бутэлек, якія засмечваюць навакольнае асяроддзе, як наогул рацыянальна абыходзіцца з вытворчымі і бытавымі адходамі. І рэалізацыяй ідэй яна, несумненна, зоймецца праз пэўны час. А пакуль — яе сонейкі, святло ў яе акенцы —

## Іван, Ілья і Леначка

Дзеці нарадзіліся 5 студзеня мінулага года. Калядная трайня адразу стала славутасцю раддома і зонай павышанай увагі медперсаналу. Зараз, праз год, Вольга Міхальчук з асаблівай удзячнасцю, цеплынёй успамінае дактароў, сястрычак медыцынскай установы, якія першымі падтрымалі. Іх спагада і мудрасць былі вельмі патрэбныя маладой маці. Дзеці адразу трапілі ў аддзяленне рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі, як бывае ў такіх выпадках. Загадчыка аддзялення Сяргея Філатава з глыбокай пашанай згадваюць дзясяткі, а то і сотні мамаў з Брэста і Брэстчыны, у тым ліку і аўтар гэтых радкоў. Урокі Сяргея Віктаравіча і яго калег па выхаванні немаўлят вельмі дапамагаюць у далейшым.

— Які перыяд за гэты доўгі год падаўся самым цяжкім? — цікаўлюся ў Вольгі.

— Не ведаю... як прыехалі з бальніцы дадому, неяк спакойна стала, і ўсё пайшло сваім парадкам. Мяне палохаюць сяброўкі, сваячкі, што самае цяжкае будзе ад года да двух, калі дзеці пачнуць хадзіць...

Цяжкім яна не лічыць тое, што кожную ноч дзеці два разы прачынаюцца для кармлення. Педыятр гаворыць, што ўжо час адыходзіць ад начных трапезаў. Але як гэта зрабіць, калі ўсталяваўся менавіта такі рэжым, ніхто дакладна не скажа. Наогул жа за ноч даводзіцца падымацца разоў шэсць. Але ж гэта часова. Радасць ад зносінаў з дзецьмі перакрывае ўсе клопаты. «Я ўжо не магу ўявіць сабе, — кажа Вольга, — каб некага з іх не было. Яны ж такія розныя». Праўда, хлопчыкі паказваюць сябе больш жвавымі і цікаўнымі. Аленка ж — па-жаночы больш разважлівая і асцярожная. Усе трое тэпаюць, калі іх вядзеш за ручкі. Самастойна перамяшчаюцца альбо паўзком, альбо стоячы каля крэсла ці канапы. Аж вочы разбягаюцца сачыць за ўсімі адразу. Ілья раз-пораз спрабуе пранікнуць на кухню, дзе знаходзіцца яму непажадана, бо на падлозе — халаднаватая плітка. Лена тым часам абследуе шарыкі на ёлцы. А Іван канстатуе падзенне любімай цацкі: «Бах». Мама толькі паспявае завіхацца каля кожнага з іх. І гэта толькі пасляабедзеннае гулянне. А прыгатаваць ежу, накарміць, памыць-папрасаваць, пагуляць на вуліцы...

Дапамагае Вользе нянька Марыя, якую, згодна з заканадаўствам, выдзяляе шматдзетнай сям'і сацыяльная служба. Вядома, за 300 тысяч рублёў, якія належаць няньцы трайні ў якасці аплаты працы, знайсці чалавека было б цяжка. У такіх выпадках звычайна бацькі даплачваюць пэўную суму па дамоўленасці. А нянька сям'і патрэбная, бо пагуляць адной з дзвюма каляскамі адначасова было б проста немагчыма. З Машай, лічыць Вольга, ім пашанцавала. Яна хоць і маладая, але вельмі ўважлівая і адказная дзяўчына, да таго ж сама вырасла ў вялікай сям'і і дапамагала маці выхоўваць малодшых. Але ў няньні, як ва ўсякага работніка, два выхадныя, святочныя дні, бывае водпуск, яна можа захварэць ці адлучыцца на экзамен. Тады Вольга спраўляецца сама. Вечарам і ў выхадныя дні дапамагае муж.

Мікалай Міхальчук працуе дырэктарам Палескага аграрна-экалагічнага інстытута, рыхтуе доктарскую дысертацыю. Мабыць, абарону давядзецца на пэўны час адкласці, так бы мовіць, па сямейных абставінах. Пра гэта лепей было б спытаць у самога дысертанта, але падчас майго наведвання ён быў на працы. Ды засталося настойлівае адчуванне, што Мікалай Васільевіч абавязкова сказаў бы, як ён ганарыцца жонкай, маці сваіх трайнятак, якім пайшоў другі гадок.

Летам яны ўжо наведвалі па чарзе бабуляў. Адна жыве ў Кобрынскім раёне, другая — у Маларыцкім. Але пакуль што яны амаль невыязныя. Тым больш што ў сваім вялікім пасёлку Мухаўцы Міхальчукі ўжо сталі мясцовай знакамітасцю. Так, на пытанне вашага карэспандэнта, дзе вуліца Фруктовая, сустрэчная жанчына адказаць адразу не змагла, а калі я ўдакладніла, што там жыве сям'я, дзе трайняты растуць, яна адразу паказала, як туды ісці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Брэсцкі раён.*

Святы вечар

# ЗВЫЧАЙНЫЯ ЦУДЫ

**Адна з маіх знаёмых вельмі любіць чытаць (у «Звяздзе» таксама) пра дзівосы, што адбываюцца ў свеце. Але ж навошта так далёка хадзіць? Калі добранька напружыць памяць, то цуды, хай невялічкія, адбываліся і побач. Не верыце? Дарэмна!**

Непадалёк ад Міёраў, у вёсцы Маеўцы, жыў мой дзядуля Пётр — чалавек ён быў сумленны, працавіты, набожны... І вось гадоў у 70 ён цяжка захварэў. Як сапраўдны хрысціянін у такім выпадку, папрасіў сыноў, каб прывезлі святара (перад смерцю паспавядацца), блаславіў сваіх родных і... заснуў.

Спіць сабе і бачыць, як да ложка ідзе святы Мікола, чуе, як кажа яму: «Пётр, ты сваімі добрымі ўчынкамі заслужыў яшчэ 10 гадоў жыцця»...

Не паверыце, але так яно і выйшла.

Зноў жа непадалёк — у 3 кіламетрах ад Міёраў на хутары Ракавыя — жыў Анатоль Томка. Чым слаўны быў? Цудоўным голасам, спевамі... А яшчэ тым, што любіў пакірмашаваць, пагутарыць з людзьмі і добра выпіць...

Дык вось, калі аднойчы пасля гэтага бег дадому (выпіўшы, ён заўсёды бег, а не ішоў), праламаўся пад ім лёд на Міёрскім возеры, і дзядзька стаў тануць.

Ад жаху ўмомант працверазеў, стаў гучна крычаць, клікаць на дапамогу. Але ж паблізу нікога не было — ніводнай душачкі жывой...

І тады кандыдат у тапельцы на ўсю моц сваіх лёгкіх закрычаў:

— Матачка Боская Міёрская, ратуй няшчаснага п'яніцу!

І во дзіва: ухапіўся ён за ўскраек палонкі, падцягнуўся на лёд, які больш пад ім не ламаўся.

Альбо вось яшчэ.

Ёсць добры хрысціянскі звычай перад святам Усіх Святых прыбіраць магілы... Што мы і робім. Пазалетась, значыць, я ўсіх сваіх памерлых праведаў, усюды — у дзядоў, у бацькоў, у цесця з цешчай — парадак навёў. Шчыра скажу — натаміўся, але ж трэба, думаю, хоць адну з запушчаных магілак прыбраць, з тых, за якімі і даглядаць ужо няма каму. Выбраў (на ёй, беднай, за апалым лісцем нават крыжа не бачна), тузануў за дзверцы ў агароджы — марна, не адчыняюцца, як прыкаваў іх хто. Во, думаю, ліха....

Але ж не лёс адчыніць, дык дай хоць памалюся па гэтым нябожчыку. Памаліўся. Адыходзячы, яшчэ раз пакратаў дзверцы. Яны... лёгенька расчыніліся!

Пасля гэтага я вынес з магілкі некалькі мяшкоў апалага лісця...

Яшчэ адзін цуд здарыўся з маёй пляменніцай Волечкай. Калі ёй было гадоў з 10, яе татка ехаў у камандзіроўку ў Дзісну і ўзяў з сабою дачушку. Пакуль сам працаваў, дзяўчынка хадзіла, разглядала незнаёмы горад. І ўвагу яе прыкавала царква, што стаяла непадалёк ад ракі. Была яна з разбітым купалам, з трэшчынамі ў сценах...

Дзяўчынка падышла бліжэй. Дзверы цэркаўкі былі адчыненыя — зайшла ўсярэдзіну. Стаіўшы дыханне, паразглядалася там, праз разбіты купал убачыла сумнае, хмурнае неба... І раптам царква заззяла яркім прамяністым святлом, аднекуль з вышыні пачуўся голас:

— Ты, Вольга, калі станеш дарослай, павінна адрадзіць гэты горад.

...Што цяпер і робіць Вольга Аляксандраўна Мароз — старшыня Дзісненскага гарсавета...

І напрыканцы.

Неяк мой дзядуля з унукам Франакам быў у Міёрскім касцёле. Ішла імша. Дзядуля, прытуліўшы да сябе мальца, не адрываючы вачэй ад абраза Маці Божай, шчыра маліўся. І раптам абраз заззяў: Маці Божая ажыла! Дзядуля прашаптаў:

— Глянь, глянь, Франак, як свеціцца гэты абраз!

Хлопчык, аднак, нічога такога не ўбачыў, але словы дзядулевы добра запомніў. Таму, калі гаворка ідзе пра цудоўныя абразы, то да іх ліку я адношу і абраз Маці Божай Міёрскай.

А наконт цудаў...

Нехта іх бачыць, а нехта — не...

**Браніслаў МАРОЗ.**

*г. Міёры.*

# Закон Рэспублікі Беларусь

## Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь»

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 9 снежня 2009 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 17 снежня 2009 года*

**Артыкул 1.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 1998 года «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 35, ст. 516; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 8, 2/932; 2007 г., № 4, 2/1292) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. Артыкул 5 пасля часткі другой дапоўніць часткай наступнага зместу:

«Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі лічацца тымі, хто ажыццяўляў свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове на працягу склікання пры ўмове, што яны не пазней як праз тры месяцы з дня першага пасяджэння новавыбранай адпаведнай палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь перайшлі на прафесійную работу ў Парламент і ажыццяўлялі яе да заканчэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў, вызначанага часткай другой гэтага артыкула.»;

часткі трэцюю і чацвёртую лічыць адпаведна часткамі чацвёртай і пятай.

2. Артыкулы 6 і 7 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 6. Умовы ажыццяўлення дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, членам Савета Рэспублікі сваіх паўнамоцтваў**

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў ажыццяўляе свае паўнамоцтвы ў Парламенце на прафесійнай аснове, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Член Савета Рэспублікі ажыццяўляе свае паўнамоцтвы ў Парламенце на прафесійнай аснове альбо без адрыву ад працоўнай (службовай) дзейнасці. Ён вызваляецца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў па месцы асноўнай працы на час ажыццяўлення ім сваіх паўнамоцтваў.

На дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, якія ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове, распаўсюджваюцца палажэнні Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2003 года «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 70, 2/953) з улікам асаблівасцяў, вызначаных гэтым Законам. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі па ўзроўні заработнай платы, медыцынскага, санаторна-курортнага і сацыяльна-побытавага забеспячэння прыраўноўваюцца да міністраў Рэспублікі Беларусь.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі, якія ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове, не маюць права:

1) займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю асабіста або праз davераных асобаў, садзейнічаць блізкім сваякам у ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці, выкарыстоўваючы службовае становішча;

2) браць удзел асабіста або праз даверных асобаў у кіраванні камерцыйнай арганізацыяй, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі;

3) мець рахункі ў замежных банках, за выключэннем выпадкаў выканання дзяржаўных функцый у замежных дзяржавах і іншых выпадкаў, вызначаных заканадаўчымі актамі;

4) займацца ў працоўны час іншай аплатнай працай (дзейнасцю), акрамя выкладчыцкай, навуковай, культурнай, творчай дзейнасці, медыцынскай практыкі, якія ажыццяўляюцца па ўзгадненні са Старшынёй адпаведнай палаты;

5) выконваць працу на ўмовах сумяшчальніцтва, акрамя працы ў дзяржаўных арганізацыях, у парадку і на ўмовах, вызначаных заканадаўствам аб працы;

6) займаць іншыя дзяржаўныя пасады, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, іншымі заканадаўчымі актамі;

7) прымаць маёмасць (падарункі) або атрымліваць іншую выгаду ў выглядзе паслугі ў сувязі з выкананнем службовых абавязкаў, за выключэннем сувеніраў, якія ўручаюцца пры правядзенні пратакольных і іншых афіцыйных мерапрыемстваў. Атрыманыя пры правядзенні пратакольных і іншых афіцыйных мерапрыемстваў сувеніры, кошт якіх перавышае пяць базавых велічыняў, перадаюцца ў даход дзяржавы па рашэнні камісіі, якая ствараецца Старшынёй адпаведнай палаты;

8) выкарыстоўваць у пазаслужбовых мэтах сродкі матэрыяльна-тэхнічнага, фінансавага і інфармацыйнага забеспячэння, іншую маёмасць адпаведнага дзяржаўнага органа і службовую тайну;

9) прымаць без згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўныя ўзнагароды замежных дзяржаў.

Ажыццяўленне паўнамоцтваў дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі на прафесійнай аснове не дапускаецца ў выпадку іх блізкіх роднасці або сваяцтва (бацькі, муж ці жонка, дзеці, родныя браты, сёстры, а таксама бацькі, дзеці, родныя браты і сёстры мужа ці жонкі) з іншым дзяржаўным служачым, калі іх службовая дзейнасць звязаная з непасрэднай падпарадкаванасцю або падкантрольнасцю аднаго з іх другому.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі на працягу трох месяцаў пасля выбрання (прызначэння) на пасаду абавязаны перадаць у вызначаным заканадаўствам парадку ў давернае кіраванне пад гарантыю дзяржавы на час ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў на прафесійнай аснове ў Парламенце прыналежныя ім долі ўдзелу (акцыі, правы) у статутным фондзе камерцыйных арганізацый, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі, якія ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове, даюць пісьмовае абавязацельства па захаванні абмежаванняў, вызначаных часткамі чацвёртай — шостай гэтага артыкула.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў можа быць адначасова членам Урада Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 7. Дэкляраванне даходаў і маёмасці дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, іх мужа (жонкі) і поўнагадовых блізкіх сваякоў**

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі, якія ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове, іх муж (жонка) і поўнагадовыя блізкія сваякі (бацькі, дзеці, усынавіцелі, усыноўленыя (удачароныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі), якія сумесна з імі пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, абавязаныя падаваць дэкларацыі аб даходах і маёмасці ў выпадках і парадку, вызначаных заканадаўчымі актамі.».

3. У артыкуле 8:

у частцы першай:

пункт 3 дапоўніць словамі «або абмежавана дзеяздольнымі»;

пункт 7 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«7) у выпадку спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь;»;

дапоўніць частку пунктам 10 наступнага зместу:

«10) у выпадку непадпісання абавязацельства, прадугледжанага часткай сёмай артыкула 6 гэтага Закона.»;

пасля часткі першай дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«Паўнамоцтвы дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, якія ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове, па рашэнні адпаведнай палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь могуць быць датэрмінова спынены ў выпадку:

1) непадачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці або наўмыснага ўнясення ў яе няпоўных, недакладных звестак;

2) незахавання абмежаванняў, вызначаных часткамі чацвёртай — шостай артыкула 6 гэтага Закона.»;

часткі другую — чацвёртую лічыць адпаведна часткамі трэцяй — пятай.

4. Артыкул 10 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 10. Службовыя пасведчанні і нагрудныя знакі дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі**

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі маюць службовыя пасведчанні і нагрудныя знакі, якімі яны карыстаюцца на працягу тэрміну сваіх паўнамоцтваў. Ніхто не мае права патрабаваць ад дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі пры выкананні імі службовых абавязкаў прад'яўлення іншых, акрамя службовых пасведчанняў, дакументаў, якія сведчаць асобу дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі і пасады, якія яны займаюць.

Службовыя пасведчанні выдаюцца дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, членам Савета Рэспублікі ў парадку, вызначаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Нагрудныя знакі дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі заснноўваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.».

5. У пункце 7 часткі першай артыкула 11 словы «ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў» замяніць словамі «іншых арганізацый».

6. Частку першую артыкула 13 пасля слоў «Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь» дапоўніць словамі «, Законам Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 года «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 172, 2/1467)».

7. Часткі шостую і сёмую артыкула 16 выключыць.

8. Частку чацвёртую артыкула 17 выключыць.

9. У артыкуле 18:

у частцы першай словы «ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў» і «ўстановы, арганізацыі, прадпрыемствы» замяніць адпаведна словамі «іншых арганізацый» і «іншай арганізацыі»;

у частцы другой словы «ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў незалежна ад формаў уласнасці і падпарадкавання (далей — прадпрыемства)» замяніць словамі «іншых арганізацый»;

у частцы трэцяй словы «ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў» замяніць словамі «іншых арганізацый»;

у частцы шостай слова «заканадаўствам» замяніць словамі «заканадаўчымі актамі».

10. У артыкуле 20:

у назве артыкула словы «ўстановы, арганізацыі, на прадпрыемствы» замяніць словам «арганізацыі»;

у частцы першай словы «ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў» замяніць словамі «іншых арганізацый»;

у частцы другой словы «ўстановы, арганізацыі, на прадпрыемствы» замяніць словамі «іншыя арганізацыі».

11. У артыкуле 21 словы «ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў» замяніць словамі «іншых арганізацый».

12. У артыкуле 22:

у частцы першай словы «кантрольных» і «ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў» замяніць адпаведна словамі «кантралюючых (наглядных)» і «іншых арганізацый»;

у частцы другой словы «дзяржаўных органаў, органаў грамадскіх аб'яднанняў, устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў, а таксама работнікі міліцыі, да якіх» замяніць словамі «праваахоўных або кантралюючых (наглядных) органаў, іншых дзяржаўных органаў, органаў грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый, якім».

13. У артыкуле 24:

у частцы першай словы «працоўнымі калектывамі» і «працоўныя калектывы» замяніць адпаведна словамі «калектывамі работнікаў» і «калектывы работнікаў»;

у частцы другой словы «своечасовым» і «прыём грамадзян» замяніць адпаведна словамі «належнаму» і «асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў і прадстаўнікоў юрыдычных асобаў (далей — асабісты прыём)».

14. Артыкул 25 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 25. Разгляд дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, членам Савета Рэспублікі зваротаў грамадзян і юрыдычных асобаў**

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі:

1) разглядаюць атрыманыя імі прапановы, заявы і скаргі грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, і юрыдычных асобаў (далей — звароты грамадзян і юрыдычных асобаў), прымаюць меры па іх поўным, аб'ектыўным, усебаковым і своечасовым разглядзе ў адпаведнасці з заканадаўствам аб зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў;

2) вывучаюць прычыны зваротаў грамадзян і юрыдычных асобаў і ўносяць свае прапановы па ўдасканальванні заканадаўства ў адпаведных сферах грамадскіх адносінаў, якія закранаюць правы і інтарэсы грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, і юрыдычных асобаў, у Палату прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі і іх органы, мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя дзяржаўныя органы, органы грамадскіх аб'яднанняў, іншыя арганізацыі;

3) ажыццяўляюць кантроль за разглядам атрыманых імі зваротаў грамадзян і юрыдычных асобаў у дзяржаўных органах, органах грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацыях, бяруць асабісты ўдзел у іх разглядзе і кантролі за рэалізацыяй прынятых па зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў рашэнняў;

4) пры неабходнасці могуць па ўзгадненні са службовымі асобамі дзяржаўных органаў, органаў грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый, размешчаных на тэрыторыі выбарчай акругі, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, прыцягваць гэтых службовых асобаў да ўдзелу ў асабістым прыёме, разглядзе зваротаў грамадзян і юрыдычных асобаў. Не пазней чым за тры дні да пачатку асабістага прыёму дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі паведамляюць кіраўніку дзяржаўнага органа, органа грамадскага аб'яднання, іншай арганізацыі аб часе і месцы правядзення асабістага прыёму.

Па выніках разгляду зваротаў грамадзян і юрыдычных асобаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі могуць накіроўваць прадстаўленне службовым асобам праваахоўных або кантралюючых (наглядных) органаў, іншых дзяржаўных органаў, органаў грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый.».

15. У частцы другой артыкула 29 словы «ўстановы, арганізацыі і на прадпрыемствы» замяніць словамі «іншыя арганізацыі».

16. Назву главы 4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«ГЛАВА 4**
**АСНОЎНЫЯ ГАРАНТЫІ ДЗЕЙНАСЦІ ДЭПУТАТА ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ, ЧЛЕНА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ. АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ ПАТРАБАВАННЯЎ ГЭТАГА ЗАКОНА».**

17. У артыкуле 31:

у частцы другой словы «ўстановы, арганізацыі, прадпрыемствы» замяніць словамі «іншыя арганізацыі»;

у частцы пятай словы «прыёму грамадзян, разгляду іх зваротаў» і «дзяржаўнай установы, арганізацыі, прадпрыемства, якія знаходзяцца на тэрыторыі» замяніць адпаведна словамі «асабістага прыёму, разгляду зваротаў грамадзян і юрыдычных асобаў» і «іншай арганізацыі, размешчанай на тэрыторыі выбарчага».

18. У артыкуле 32:

з часткі першай слова «дзеючаму» выключыць;

дапоўніць артыкул часткай пятай наступнага зместу:

«Для дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі, якія ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове, з ліку вайскоўцаў, асобаў радавога і начальніцкага складу органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях умовы выплаты грашовага забеспячэння і грашовай кампенсацыі ўзамен харчовага пайка, а таксама ўмовы выдачы рэчавай маёмасці, вызначаныя заканадаўствам, не захоўваюцца.».

19. Частку другую артыкула 36 пасля слоў «Па прад'яўленні» дапоўніць словам «службовага».

20. У артыкуле 37 словы «і ваенныя» замяніць словамі «, службу ў рэзерве, ваенныя і спецыяльныя».

21. У артыкуле 38:

з часткі другой словы «прадпрыемствы, установы,» выключыць;

частку чацвёртую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Час працы дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі ў Парламенце на прафесійнай аснове залічваецца ў стаж дзяржаўнай службы, а таксама ў стаж працы (службы) па спецыяльнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам.»;

пасля часткі чацвёртай дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«Тэрмін паўнамоцтваў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі, якія ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове, з ліку вайскоўцаў, асобаў радавога і начальніцкага складу органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях залічваецца ў тэрмін выслугі ў вайсковым, спецыяльным званні, а таксама ў выслугу гадоў, якая дае права на пенсійнае забеспячэнне.»;

частку пятую лічыць часткай шостай.

22. У артыкуле 39:

у назве артыкула словы «Дзяржаўнае асабістае» замяніць словамі «Абавязковае дзяржаўнае»;

з часткі першай слова «асабістаму» выключыць;

частку трэцюю пасля слоў «выплат па» дапоўніць словам «абавязковым».

23. Артыкул 41 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 41. Сацыяльнае забеспячэнне дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі**

Пенсійнае забеспячэнне дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, у тым ліку за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пенсійным заканадаўствам з улікам асаблівасцяў, вызначаных Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь».

Асаблівасці сацыяльнага забеспячэння дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, у тым ліку іх штомесячнае грашовае забеспячэнне, вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.».

24. У артыкуле 43:

у частцы першай словы «ўстановы, арганізацыі і прадпрыемствы» замяніць словамі «іншыя арганізацыі»;

у частцы трэцяй словы «ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў» замяніць словам «арганізацый».

25. У артыкуле 44 словы «ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў» замяніць словамі «іншых арганізацый».

26. У артыкуле 47:

у частцы трэцяй слова «арыштаваныя» замяніць словам «затрыманыя»;

у частцы чацвёртай словы «калі гэта прадугледжана дзеючым заканадаўствам» замяніць словамі «прадугледжаных заканадаўчымі актамі».

27. Артыкул 48 выключыць.

28. Артыкул 49 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 49. Выдача дыпламатычнага пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь дэпутату Палаты прадстаўнікоў, члену Савета Рэспублікі**

Выдача дыпламатычнага пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь дэпутату Палаты прадстаўнікоў, члену Савета Рэспублікі ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.».

29. У артыкуле 51:

у частцы першай:

пункт 1 пасля слоў "запіс на" дапоўніць словам «асабісты»;

у пункце 2 словы «прыёму грамадзян» замяніць словамі «асабістага прыёму, які праводзіцца»;

у пункце 3 словы «прыём грамадзян» замяніць словамі «асабісты прыём»;

у пункце 4 словы «ўстановах, арганізацыях і на прадпрыемствах» замяніць словамі «іншых арганізацыях»;

у пунктах 1 і 3 часткі другой словы «ўстаноў, арганізацый і прадпрыемстваў» замяніць словамі «іншых арганізацый».

30. У артыкуле 52:

у частцы другой словы «ўстановы, арганізацыі і прадпрыемствы» замяніць словам «арганізацыі»;

частку восьмую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Памочнікам дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі выдаюцца службовыя пасведчанні ў парадку, вызначаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.».

31. Дапоўніць Закон артыкулам $52^1$ наступнага зместу:

**«Артыкул $52^1$. Адказнасць за парушэнне патрабаванняў гэтага Закона**

Парушэнне патрабаванняў гэтага Закона цягне адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.».

32. Главу 5 выключыць.

**Артыкул 2.** Гэты Закон уваходзіць у сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**

*4 студзеня 2010 года, г. Мінск.*
*№ 106—З*

# Закон Рэспублікі Беларусь

## АБ СТАТУСЕ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 11 снежня 2009 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 17 снежня 2009 года*

**Гэты Закон вызначае статус ваеннаслужачых, асновы дзяржаўнай палітыкі ў галіне прававой і сацыяльнай абароны ваеннаслужачых, грамадзян, звольненых з ваеннай службы, і членаў іх сем'яў.**

**ГЛАВА 1**
**АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

**Артыкул 1. Асновы статусу ваеннаслужачых**

Статус ваеннаслужачых — сукупнасць правоў, свабод, абавязкаў і адказнасці ваеннаслужачых, устаноўленых Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь (далей — заканадаўчыя акты), у тым ліку міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь (далей — міжнародныя дагаворы).

Змест і аб'ём правоў, свабод, абавязкаў і адказнасці ваеннаслужачых залежаць ад таго, знаходзяцца яны або не знаходзяцца пры выкананні абавязкаў ваеннай службы.

Ваеннаслужачыя знаходзяцца пры выкананні абавязкаў ваеннай службы ў час:

выканання ўскладзеных на іх абавязкаў у размяшчэнні вайсковых часцей, ваенных навучальных устаноў, органаў ваеннага кіравання і арганізацый Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў Рэспублікі Беларусь (далей, калі не пазначана іншае, — вайсковая часць) або па-за імі, калі гэта выклікана службовай неабходнасцю;

удзелу ў баявых дзеяннях, вучэннях;

нясення баявога дзяжурства, баявой службы;

знаходжання ў сутачным або гарнізонным нарадах;

знаходжання на зборах, у службовых камандзіроўках або на лячэнні;

накіравання да месца службы, лячэння і назад;

знаходжання ў палоне (акрамя выпадкаў добраахвотнай здачы ў палон), становішчы закладніка або інтэрніраванага;

адсутнасці без вестак — да прызнання ваеннаслужачага без вестак адсутным або абвяшчэння памерлым у парадку, вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь (далей — заканадаўства);

аказання дапамогі праваахоўным органам у забеспячэнні законнасці і правапарадку;

абароны жыцця, здароўя, гонару і годнасці грамадзян;

ажыццяўлення іншых дзеянняў, прызнаных судом ажыццёўленымі ў інтарэсах асобы, грамадства і дзяржавы.

Не прызнаюцца выканаўцамі абавязкаў ваеннай службы ваеннаслужачыя:

якія знаходзяцца па-за размяшчэннем вайсковай часці, у звальненні або водпуску, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных абзацамі восьмым — дванаццатым часткі трэцяй гэтага артыкула;

якія самавольна знаходзяцца па-за размяшчэннем вайсковай часці або ўстаноўленага за яе межамі месца службы, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных абзацамі восьмым — дванаццатым часткі трэцяй гэтага артыкула;

якія добраахвотна прывялі сябе ў стан алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап'янення;

якія ўчыняюць правапарушэнні, прадугледжаныя Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь і Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях;

якія ўчыняюць самазабойства або спробу самазабойства, калі названыя дзеянні не былі выкліканы хваравітым станам або давядзеннем да самазабойства.

Статус ваеннаслужачага набываецца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь (далей — грамадзяне) з дня пачатку знаходжання на ваеннай службе і страчваецца з дня, які надыходзіць за днём заканчэння знаходжання на ваеннай службе.

Ваеннаслужачыя валодаюць правамі і свабодамі, якія ўстаноўлены заканадаўствам для іншых грамадзян, з абмежаваннямі, абумоўленымі асаблівасцямі ваеннай службы і прадугледжанымі гэтым Законам, іншымі заканадаўчымі актамі. Асаблівасці ваеннай службы заключаюцца ва ўскладанні на ваеннаслужачых абавязкаў па падрыхтоўцы да ўзброенай абароны і па ўзброенай абароне Рэспублікі Беларусь, якія звязаны з неабходнасцю беспярэчнага выканання пастаўленых задач у любых умовах, у тым ліку з павышанай рызыкай для жыцця і здароўя. Абмежаванне ваеннаслужачых у правах і свабодах кампенсуецца забеспячэннем іх дзяржавай дадатковымі сацыяльнымі льготамі, правамі і гарантыямі.

Ваеннаслужачым выдаецца дакумент, які сведчыць асобу і статус ваеннаслужачага.

Ваеннаслужачыя маюць права на прымяненне фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, захоўванне, нашэнне, выкарыстанне і прымяненне зброі, баявой і спецыяльнай тэхнікі ў выпадках і парадку, вызначаных заканадаўчымі актамі.

Ваеннаслужачыя маюць права на абгрунтаваную прафесійную рызыку. Прафесійная рызыка прызнаецца абгрунтаванай, калі ажыццёўленае ваеннаслужачым дзеянне аб'ектыўна вынікала са становішча, якое склалася, пастаўленая мэта не магла быць дасягнутая не звязанымі з рызыкай дзеяннямі, а ваеннаслужачы прыняў усе магчымыя меры для прадухілення шкоды інтарэсам, якія ахоўваюцца законам.

Асаблівасці статусу ваеннаслужачых, абраных у дзяржаўныя органы, прыкамандзіраваных да дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, якія праходзяць ваенную службу за межамі Рэспублікі Беларусь, у ваенных судах і ваеннай пракуратуры, у перыяд мабілізацыі, ваеннага становішча і ў ваенны час вызначаюцца заканадаўчымі актамі, у тым ліку міжнароднымі дагаворамі.

**Артыкул 2. Грамадзяне, якія маюць статус ваеннаслужачых**

Статус ваеннаслужачых маюць:

ваеннаслужачыя, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, у тым ліку слухачы і курсанты ваенных навучальных устаноў, іншых устаноў адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку афіцэрскіх кадраў для Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь і іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў Рэспублікі Беларусь (далей — іншыя ўстановы адукацыі);

ваеннаслужачыя, якія праходзяць ваенную службу па прызыве;

грамадзяне, якія праходзяць службу ў рэзерве (далей — рэзервісты), — пры знаходжанні на занятках або вучэбных зборах, вызначаных праграмамі падрыхтоўкі рэзервістаў;

ваеннаабавязаныя — пры знаходжанні на ваенных або спецыяльных зборах.

Афіцэры, якія праходзяць ваенную службу па прызыве, па сваім прававым становішчы прыраўноўваюцца да афіцэраў, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

**Артыкул 3. Грамадзяне, на якіх распаўсюджваюцца асобныя сацыяльныя льготы, правы і гарантыі, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі для ваеннаслужачых**

Асобныя сацыяльныя льготы, правы і гарантыі, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі для ваеннаслужачых, у парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца заканадаўствам, распаўсюджваюцца на:

грамадзян, звольненых з ваеннай службы;

членаў сем'яў ваеннаслужачых;

членаў сем'яў грамадзян, звольненых з ваеннай службы, у тым ліку пасля смерці гэтых грамадзян;

членаў сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі (памерлі), прапалі без вестак або сталі інвалідамі пры выкананні абавязкаў ваеннай службы, а таксама членаў сем'яў грамадзян, якія памерлі пасля звальнення з ваеннай службы з-за ранення (кантузіі), траўмы або калецтва, атрыманых пры абароне Рэспублікі Беларусь або пры выкананні іншых абавязкаў ваеннай службы, або захворвання, звязанага са знаходжаннем на ваеннай службе;

інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны і інвалідаў баявых дзеянняў на тэрыторыі замежных дзяржаў, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

суворваўцаў, выхаванцаў вайсковых часцей.

Да членаў сем'яў ваеннаслужачых, грамадзян, звольненых з ваеннай службы, на якіх распаўсюджваюцца асобныя сацыяльныя льготы, правы і гарантыі, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі для ваеннаслужачых, калі іншае не ўстаноўлена іншымі заканадаўчымі актамі, адносяцца:

жонка (муж);

няпоўнагадовыя дзеці;

дзеці, старэйшыя за 18 гадоў, якія сталі інвалідамі да дасягнення імі ўзросту 18 гадоў;

дзеці ва ўзросце да 23 гадоў, якія вучацца ва ўстановах адукацыі ў вочнай форме атрымання адукацыі;

іншыя асобы, якія знаходзяцца на ўтрыманні ваеннаслужачых.

**Артыкул 4. Прававая і сацыяльная абарона ваеннаслужачых, грамадзян, звольненых з ваеннай службы, і членаў іх сем'яў**

Ваеннаслужачым устанаўліваецца адзіная сістэма мераў прававой і сацыяльнай абароны, у тым ліку грашовага, матэрыяльнага і іншых відаў забеспячэння, у адпаведнасці з воінскімі пасадамі (далей — пасады), якія яны займаюць, воінскімі званнямі, кваліфікацыяй, працягласцю і ўмовамі ваеннай службы.

Прававая абарона ваеннаслужачых, грамадзян, звольненых з ваеннай службы, і членаў іх сем'яў з'яўляецца функцыяй дзяржавы і прадугледжвае замацаванне ў заканадаўчых актах правоў і свабод, абавязкаў і адказнасці, сацыяльных ільгот і гарантый названым асобам, а таксама прававога механізму іх рэалізацыі.

Сацыяльная абарона ваеннаслужачых, грамадзян, звольненых з ваеннай службы, і членаў іх сем'яў з'яўляецца функцыяй дзяржавы і ажыццяўляецца праз практычную рэалізацыю замацаваных у заканадаўчых актах іх правоў і свабод, абавязкаў і адказнасці (у тым ліку забеспячэнне іх сацыяльнымі льготамі і гарантыямі органамі ваеннага кіравання і іншымі дзяржаўнымі органамі), а таксама іншых мераў, накіраваных на забеспячэнне спрыяльных умоў іх жыццю і дзейнасці, якія адпавядаюць асабліваму характару ваеннай службы.

Рэалізацыя мераў прававой і сацыяльнай абароны ваеннаслужачых, грамадзян, звольненых з ваеннай службы, і членаў іх сем'яў ускладаецца на рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі ў межах іх паўнамоцтваў, а таксама з'яўляецца абавязкам камандзіраў (начальнікаў).

Ваеннаслужачыя, грамадзяне, звольненыя з ваеннай службы, і члены іх сем'яў, якія маюць права на сацыяльныя льготы, правы і гарантыі ў адпаведнасці з гэтым Законам, маюць права карыстацца таксама іншымі сацыяльнымі льготамі, правамі і гарантыямі, устаноўленымі для іншых грамадзян, калі іншае не вызначана заканадаўчымі актамі. Калі названыя асобы адначасова маюць права на атрыманне адной і той жа сацыяльнай ільготы, права або гарантыі па некалькіх падставах, то ім даецца па іх выбары сацыяльная льгота, права або гарантыя па адной падставе.

Ваеннаслужачым кампенсуецца шкода, нанесеная:

іх жыццю і здароўю пры выкананні абавязкаў ваеннай службы;

незаконнымі дзеяннямі (бяздзейнасцю) службовых асобаў дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, у тым ліку ў выпадку незаконных прыцягненняў да крымінальнай адказнасці, узяцця пад варту, арышту ў дысцыплінарным парадку, адхілення ад пасады, зніжэння на пасадзе, у воінскім званні, перамяшчэння па ваеннай службе, прыцягнення да матэрыяльнай і іншых відаў адказнасці;

пашкоджаннем, знішчэннем або стратай іх асабістай маёмасці або маёмасці іх членаў сям'і або іншых асобаў, якіх ваеннаслужачы абгрунтавана прызнае сваімі блізкімі (далей, калі не вызначана іншае, — блізкія), у сувязі з выкананнем абавязкаў ваеннай службы.

У выпадках, названых у абзацы трэцім часткі шостай гэтага артыкула, аднаўляюцца службовыя, пенсійныя, жыллёвыя і іншыя асабістыя маёмасныя і немаёмасныя правы ваеннаслужачых.

Ваеннаслужачыя жаночага полу карыстаюцца сацыяльнымі правамі і гарантыямі, звязанымі з аховай мацярынства і дзяцінства, устаноўленымі заканадаўствам.

Сацыяльныя правы і гарантыі, звязаныя з аховай мацярынства і дзяцінства, устаноўленыя для жанчын-маці, распаўсюджваюцца на бацькоў-ваеннаслужачых, якія выхоўваюць дзяцей без маці (у сувязі з яе смерцю, пазбаўленнем бацькоўскіх правоў, працяглым — больш за месяц, знаходжаннем у арганізацыі аховы здароўя і па іншых прычынах), а таксама ў выпадках, калі маці не можа ажыццяўляць догляд дзіцяці ў сувязі з інваліднасцю I групы або хваробай, якая перашкаджае ажыццяўленню ёю догляду дзіцяці, якая пацвярджаецца медыцынскім заключэннем у парадку, вызначаным заканадаўствам.

Члены сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі пры выкананні абавязкаў ваеннай службы, пры роўнай вытворчасці працы і кваліфікацыі карыстаюцца правам пераважнага пакідання на працы пры скарачэнні колькасці або штата работнікаў, а таксама правам на першачарговае накіраванне іх органамі дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі.

Жонкам (мужам) ваеннаслужачых выплачваецца выхадная дапамога ў памеры двухмесячнага сярэдняга заробку пры звальненні іх з працы ў сувязі з пераводам мужа (жонкі) на ваенную службу ў іншую мясцовасць.

Працуючым жонкам (мужам) ваеннаслужачых працоўны водпуск па іх жаданні дазваляецца адначасова з водпускам іх мужоў (жонак) і можа дазваляцца кароткатэрміновы водпуск без захавання заработнай платы з улікам працягласці водпуску мужа (жонкі).

На органы дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва ўскладаецца працаўладкаванне не пазней за двухмесячны тэрмін з дня звароту жонак, мужы якіх прызваны на тэрміновую ваенную службу. У выпадку немагчымасці працаўладкавання ім выплачваецца дапамога па беспрацоўі ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

Дзецям ваеннаслужачых, а таксама дзецям мужа (жонкі) ваеннаслужачых гарантуецца выдзяленне месцаў ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі, на працягу трох месяцаў з дня падачы заявы.

З грамадзянамі, якія праходзілі тэрміновую ваенную службу, звольненымі з ваеннай службы і накіраванымі на працу ў кошт брані для выдзялення першага працоўнага месца, забараняецца неабгрунтаванае адмаўленне ў заключэнні працоўнага дагавора.

**ГЛАВА 2**
**ПРАВЫ І СВАБОДЫ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ, ГРАМАДЗЯН, ЗВОЛЬНЕНЫХ З ВАЕННАЙ СЛУЖБЫ, ЧЛЕНАЎ ІХ СЕМ'ЯЎ**

**Артыкул 5. Абарона свабоды, гонару і годнасці ваеннаслужачых**

Ваеннаслужачыя пры выкананні абавязкаў ваеннай службы з'яўляюцца прадстаўнікамі дзяржаўнай улады і знаходзяцца пад абаронай дзяржавы.

Замахі або пагроза замаху на жыццё, здароўе, гонар, годнасць і маёмасць ваеннаслужачага ў сувязі з выкананнем ім абавязкаў ваеннай службы або ўчыненне названых дзеянняў у дачыненні да яго блізкіх цягнуць адказнасць, устаноўленую заканадаўчымі актамі.

Ніхто не мае права ўмешвацца ў службовую дзейнасць ваеннаслужачых, за выключэннем асобаў, упаўнаважаных заканадаўчымі актамі.

Ваеннаслужачыя пры выкананні абавязкаў ваеннай службы падпарадкоўваюцца толькі тым асобам, якія ў адпаведнасці з агульнавайсковымі статутамі Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь (далей — статуты Узброеных Сілаў) з'яўляюцца для іх камандзірамі (начальнікамі).

Ваеннаслужачым не могуць аддавацца загады (распараджэнні), якія парушаюць заканадаўства.

**Артыкул 6. Права на свабоду перамяшчэння і выбар месца жыхарства, ваеннай службы**

Права на свабоду перамяшчэння рэалізоўваецца ваеннаслужачымі з улікам неабходнасці падтрымання імі баявой гатоўнасці ў вайсковай часці і забеспячэння своечасовасці прыбыцця да месца ваеннай службы, калі іншае не ўстаноўлена статутамі Узброеных Сілаў.

Ваеннаслужачыя, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, маюць права на змяненне месца жыхарства, ваеннай службы, у тым ліку шляхам прызначэння на пасаду ў іншую вайсковую часць, якая знаходзіцца ў іншай мясцовасці, з улікам стану здароўя гэтых ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў на падставе заключэння ваенна-ўрачэбнай камісіі і па іншых падставах, прадугледжаных Палажэннем аб парадку праходжання ваеннай службы, якое зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь (далей — Палажэнне аб парадку праходжання ваеннай службы).

**Артыкул 7. Права на свабоду меркаванняў, атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыі, удзел у сходах, мітынгах, вулічным шэсці, дэманстрацыях, пікетаванні і іншых масавых мерапрыемствах**

Ваеннаслужачыя пры рэалізацыі права на свабоду меркаванняў, перакананняў і іх свабоднае выказванне, атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне інфармацыі не маюць права выдаваць дзяржаўную і службовую тайну, абмяркоўваць або крытыкаваць загады камандзіра (начальніка).

Ваеннаслужачыя маюць права ў вольны ад выканання абавязкаў ваеннай службы час удзельнічаць у сходах, мітынгах, вулічным шэсці, дэманстрацыях, пікетаванні і іншых масавых мерапрыемствах, якія праводзяцца ў адпаведнасці з заканадаўствам па-за тэрыторыяй вайсковай часці.

Удзел ваеннаслужачых у забастоўках, а таксама іншае невыкананне абавязкаў ваеннай службы ў мэтах урэгулявання пытанняў, звязаных з праходжаннем ваеннай службы, забараняюцца.

**Артыкул 8. Права на свабоду аб'яднанняў**

Ваеннаслужачыя могуць быць членамі грамадскіх аб'яднанняў, якія не маюць палітычных мэтаў, і ўдзельнічаць у іх дзейнасці ў вольны ад выканання абавязкаў ваеннай службы час.

Грамадзяне, якія паступаюць на ваенную службу па кантракце або прызываюцца на ваенную службу, абавязаны прыпыніць сваё членства ў палітычных партыях і іншых грамадскіх аб'яднаннях, якія маюць палітычныя мэты.

*(Працяг будзе.)*

# Закон Рэспублікі Беларусь

## Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе»

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 4 снежня 2009 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 11 снежня 2009 года*

**Артыкул 1.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 мая 2007 года «Аб рэкламе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 119, 2/1321; 2008 г., № 196, 2/1525) наступныя змяненні:

1. Абзац дзявяты артыкула 2 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«рэкламная гульня — дзейнасць арганізацый або індывідуальных прадпрымальнікаў, якая ажыццяўляецца імі ў мэтах стымулявання рэалізацыі тавараў (работ, паслуг) і забяспечвае розыгрыш выйгрышаў паміж удзельнікамі рэкламнай гульні, за выключэннем дзейнасці, якая не адносіцца да рэкламных гульняў у адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;».

2. З часткі трэцяй пункта 2 артыкула 23 словы «правілаў правядзення» выключыць.

**Артыкул 2.** Гэты Закон уваходзіць у сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А. ЛУКАШЭНКА**

*28 снежня 2009 года, г. Мінск.*
*№ 95—З*

# Закон Рэспублікі Беларусь

## Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб узаемным унясенні адзнак аб заключэнні або скасаванні шлюбу ў пашпарты грамадзян Рэспублікі Беларусь і грамадзян Расійскай Федэрацыі

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 30 лістапада 2009 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 11 снежня 2009 года*

Ратыфікаваць Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб узаемным унясенні адзнак аб заключэнні або скасаванні шлюбу ў пашпарты грамадзян Рэспублікі Беларусь і грамадзян Расійскай Федэрацыі, заключанае шляхам абмену нотамі 4 чэрвеня 2009 года.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А. ЛУКАШЭНКА**

*28 снежня 2009 года, г. Мінск.*
*№ 76—З*

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ» СОСТОИТСЯ 25 января 2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, актовый зал (3 этаж)**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении направлений использования чистой прибыли в 2009 г.

Регистрация акционеров — в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).

УНН 600024712.

**У суд Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні памерлым **РАСІЛЕВІЧА Валянціна Валянцінавіча**, 27 жніўня 1978 года нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства: вёска Алекшыцы, вул. Маладзёжная, дом 3 Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобл. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Расілевіча В.В., паведаміць іх суду Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобл. на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Решением учредителей, ООО «М25» преобразовывается в ОДО «М25». Все претензии принимаются в письменном виде в течение 30 дней по адресу: 220049, г. Минск, ул. Чайковского, 70–9.

УНП 190870599

**Страховое свидетельство** по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ № 9361739 серия АЖ ЗАСО «Белнефтестрах» **считать недействительным**.

